16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 43 (5200) 28 кастрычніка 2022 г. ISSN 0024-4686

Мір праз культуру і асветніцтва стар. 4

Захапляльная містыка дарогі стар. 7

Стварыць з хаосу сусвет стар. 12

Асвяжальная крыніца анімацыі

Калаж Кастуся Дробава.

Сотні ўдзельнікаў з розных куткоў свету, дзясяткі фільмаў у дзвюх конкурсных і дзвюх пазаконкурсных праграмах, амаль тузін запрошаных спікераў і, самае галоўнае, удзячны глядач… У цэнтральным магілёўскім кінатэатры «Радзіма» завяршыўся XXV Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка». Арганізатары сёлетняга фесту атрымалі 174 заяўкі з 44 краін свету, з якіх 7 (Алжыр, Гана, Малайзія, Нігерыя, Новая Зеландыя, Саудаўская Аравія, Ямайка) удзельнічалі ўпершыню. Да паказу ў рамках асноўнага конкурсу экспертнай камісіяй было адабрана 48 стужак з 20 краін, у конкурс жа дзіцячай анімацыйнай творчасці трапілі 32 работы з 8 краін.

Міжнародны фестываль вядзе сваю гісторыю яшчэ ад мінулага стагоддзя і сёлета адзначае два з паловай дзесяцігоддзі плённай працы на ніве асветніцтва. За гэты час яго ўдзельнікамі паспелі стаць творцы амаль што з усіх куткоў свету, кінаэкраны горада на Дняпры прадэманстравалі тысячы анімацыйных карцін, а сам форум стаў неад'емнай часткай культурнага ландшафту нашай краіны. Крыніцы «Анімаёўкі» жывяць рэпертуар не толькі магілёўскіх ілюзіёнаў, але і кінатэатраў па ўсёй Беларусі. Так, нават пасля свайго завяршэння не збіраецца заціхаць і XXV Міжнародны фестываль. Ужо заўтра ў залах Магілёва і іншых гарадоў у рамках праграмы «Рэха "Анімаёўкі"» пачнуцца паказы фільмаў конкурсу–2022.

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі з 85-годдзем з дня заснавання ўстановы. «Адна з найстарэйшых устаноў культуры нашай краіны прайшла доўгі і слаўны шлях. На вашай легендарнай сцэне адкрылася цэлае сузор'е новых імёнаў, рэалізавана шмат яркіх праектаў», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што і ў далейшым калектыў філармоніі будзе ўзбагачаць рэпертуар найлепшымі ўзорамі класічнай і сучаснай музыкі, развіваць традыцыі, нястомна служыць захаванню і папулярызацыі ідэалаў нацыянальнай культуры і ўмацаванню дзяржаўнасці.

Пашана. Беларускаму дзяржаўнаму ансамблю «Песняры» за значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай культуры прысвоена званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь», паведамляе БелТА. У ансамблі за многія гады змянілася не адно пакаленне музыкантаў. Сёння ў яго склад уваходзяць Раман Козыраў (дырэктар — мастацкі кіраўнік; клавішныя, вакал), Алег Жалезнякоў (вакал, акустычная гітара), Юрый Туравец (барабаны), Сяргей Баёк (вакал, бас-гітара), Артур Міхайлаў (вакал), Ігар Дударчык (вакал) і Сяргей Гарбацкі (вакал, гітара). Артысты ансамбля беражліва захоўваюць залаты песенны фонд, усе музычныя традыцыі і непаўторны стыль легендарнага калектыву, развіваюць і ўзбагачаюць рэпертуар, выпускаючы новыя песні, альбомы, канцэртныя праграмы, актыўна гастраліруюць у Беларусі і за яе межамі.

Праект. Фотавыстаўка «Культурная спадчына ў краінах Садружнасці» працуе ў фае Выканаўчага камітэта СНД у Мінску. Экспазіцыя арганізавана па ініцыятыве Пастаяннага прадстаўніцтва Расійскай Федэрацыі пры ўстаўных і іншых органах СНД пры падтрымцы Савета пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД пры ўстаўных і іншых органах Садружнасці і кіраўніцтва Выканаўчага камітэта СНД. Як перадае БелТА, мэта выстаўкі — прадэманстраваць культурную спадчыну краін Садружнасці, яе разнастайнасць і агульнасць. Большасць прадстаўленых аб'ектаў матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўваходзіць у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА або з'яўляецца кандыдатамі на ўключэнне ў яго.

Актуальна. Рэстаўрацыйныя работы ў Жыліцкім палацава-паркавым ансамблі плануюць завяршыць да канца года, піша БелТА. «На гэты момант будаўнічая гатоўнасць аб'екта складае 90 працэнтаў, — адзначыў дырэктар Жыліцкага гістарычнага комплексу-музея Уладзіслаў Кулакевіч. — Гэта значыць, што мы ўжо выйшлі на фінішную прамую, і ў хуткім часе турысты і госці нашага комплексу змогуць ацаніць яго прыгажосць. Аднак работы на гэтым не заканчваюцца. Цяпер на тэрыторыі комплексу ідзе ўзвядзенне страчанай у гады Вялікай Айчыннай вайны аранжарэі. Усё гэта ўваходзіць у трэцюю чаргу работ. Пасля прыступім да прылеглай тэрыторыі: прывядзём у парадак парк, які быў разбіты яшчэ ў XIX стагоддзі, ён быў часткова пейзажны, часткова рэгулярны. Плануем надаць парку яго веліч і аднавіць вадаёмы».

Конкурс. Сямейны конкурс «Навагодняя тэатральная цацка» аб'явілі ў Вялікім тэатры Беларусі. У юбілейны, 90-ы, сезон ён пройдзе 9-ы раз. Арганізатары чакаюць работы, якія прыдумала і ўвасобіла ў жыццё ўся сям'я — гледачы тэатра. Як падкрэсліваюць арганізатары, цацка павінна быць тэатральнай, гэта значыць, нейкім чынам намякаць на той ці іншы спектакль або быць звязана з жыццём акцёра і музыканта. У тэатры нямала оперных і балетных пастановак, якія могуць натхніць таленавітых юнакоў і дзяўчат. Дарэчы, Вялікі тэатр рыхтуецца прадставіць 24 снежня казачную оперу для ўсёй сям'і: «Гісторыя Кая і Герды» ажыве дзякуючы рэжысёру Ганне Маторнай. Работы ўдзельнікаў конкурсу прымаюцца да 20 снежня. Узнагародзяць пераможцаў традыцыйна пад Новы год — 27 снежня, перад пачаткам спектакля «Гісторыя Кая і Герды».

Фестываль. «Беларуская музычная восень» 48-ы раз запрашае прыхільнікаў акадэмічнага мастацтва на канцэрты ў Вялікі і Малы залы Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Форум, які сёлета праходзіць з 25 кастрычніка да 29 лістапада, аб'яднае найлепшыя ўзоры сусветнай музычнай спадчыны, творы і імёны, закліканыя адкрыць шырокаму колу слухачоў — ад неафітаў да спрактыкаваных знаўцаў — асаблівасці розных жанраў і стыляў айчыннай і замежнай музыкі, адзначаюць арганізатары. У праграме форуму — канцэрт-феерыя «Лясны цар» (30 кастрычніка), канцэрт да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа «Мой родны кут» Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча і Дзяржаўнага камернага хору (3 лістапада), «Залатая калекцыя залатой восені» Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра (10 лістапада).

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

анонсы

Мемуары народнага

У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыў свет першы том кнігі Мікалая Чаргінца «Цяжкія дарогі жыцця». Выданне ажыццёўлена па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Народны пісьменнік Беларусі Мікалай Чаргінец расказвае пра свой лёс, з чаго пачыналася самастойнае жыццё. Згадвае сваю сям'ю, тое, якія выпрабаванні яго родныя і блізкія прайшлі ў перыяд фашысцкай акупацыі Мінска. Шмат падрабязнасцей у першым томе — пра футбольныя, спартыўныя зацікаўленні маладога чалавека. Мікалая Чаргінца ведалі тысячы аматараў футбола, прычына — высокае майстэрства спартсмена. Старонкі пра спартыўнае жыццё, як мне падаецца, асабліва цікавымі будуць маладым людзям, якія праз спорт загартоўваюць свой характар. Піша аўтар падрабязна, вымалёўваючы многія дэталі, паказваючы псіхалогію моладзі часін яго юнацтва.

Другім важным складнікам станаўлення характару, а таксама і будучых творчых здольнасцей Мікалая Чаргінца стала служба ў праваахоўных органах. Пра гэта — многія старонкі кнігі «Цяжкія дарогі жыцця».

Мікалай Чаргінец — твар нашай краіны, чалавек, які аб'ехаў дзясяткі краін, літаратар, чые кнігі перакладзены на многія мовы народаў свету: азербайджанскую, англійскую, турэцкую, персідскую, таджыкскую і іншыя. Агульны тыраж раманаў Мікалая Чаргінца, выдадзеных у розных кутках свету, — болей як 7 мільёнаў экзэмпляраў. За свае творчыя і грамадскія дасягненні народны пісьменнік адзначаны шматлікімі міжнароднымі прэміямі, дзяржаўнымі ўзнагародамі СССР, Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў. Асоба гэтага вядомага аўтара і палітыка — яскравы прыклад служэння грамадству і Айчыне.

Днямі народны пісьменнік Беларусі, ганаровы старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі адзначыў свой 85-гадовы юбілей. Сёння ў 17.00 ў Нацыянальнай бібліятэцы адбудзецца ўрачысты творчы вечар юбіляра. Набыць кнігі юбіляра і атрымаць аўтограф можна ў фае бібліятэкі пачынаючы з 15 гадзін.

Мікола БЕРЛЕЖ

У роднасных мовах…

Міхась Пазнякоў — лаўрэат многіх літаратурных прэмій, пераможца розных прэстыжных творчых конкурсаў, а самае галоўнае — любімы пісьменнік беларускай дзятвы. Міхась Паўлавіч, пяру якога належыць болей як 100 кніг, — часты госць у бібліятэках і школах краіны.

Новая кніга пісьменніка — зборнік загадак на беларуска-рускія амонімы «Дзіўныя "блізняты"» выйшла ў свет у Выдавецкім доме «Звязда» накладам 1100 экзэмпляраў. Выданне вельмі сімпатычна праілюстравала вядомы кніжны графік Дар'я Чарняўская.

Што такое амонімы? Розныя па значэнні, але аднолькавыя па напісанні словы, марфемы і інш. Паняцце ўведзена яшчэ Арыстоцелем. Ёсць дзявочая каса, а ёсць каса, якой зразаюць траву, альбо — марская каса… Ды і іншых кос хапае. А Міхась Пазнякоў у сваіх паэтычных штукарствах пайшоў далей. Ён вырашыў параўнаць, якімі рознымі па сваім значэнні бываюць аднолькавыя словы ў беларускай і рускай мовах. «За мяне павінны ў школе // Вам адзнаку выстаўляць: // Калі дрэнны — два, не болей, // А калі пасрэдны — пяць. // А калі выдатны я, // То і вышай удвая». Разгадалі? Адзнаку выстаўляюць у школе за адказ, зразумела. «Да и я знаком, ребята, // Хорошо вам с малых лет. // Все меня, признаюсь, часто // Выражают словом "нет"». А гэта ўжо — «отказ», як прыклад: «Вам ответили отказом». Па-беларуску гучала б іначай: «Адмовілі ў чымсьці…»

У кнізе 51 загадка. Малодшым школьнікам, відаць, не так і проста будзе іх адгадваць. Тады прыходзьце да сваіх настаўнікаў, яны, канешне ж, дапамогуць юным чытачам і сваім вучням. Ды і сам Міхась Паўлавіч гатовы прыйсці ў любую школу на ўрок беларускай ці рускай мовы.

Кастусь ЛЕШНІЦА

памяць

Вялікі космас мален[illegible]ага чалавека

Грунтоўнае веданне паўсядзённага вясковага побы[illegible]ту, чалавечай псіхалогіі, звычаяў, дыялектыка [illegible]рактараў, асаблівая ўвага да ўнутранага св[illegible]матыў вайны ў лёсах людзей, — асноў[illegible]рыстыкі прозы Івана Пташнікава [illegible]ма пра тое, якім быў чалавека[illegible] у вузкім коле сям'і і сяброў[illegible]ці, прымеркаваным д[illegible]

НАВІНЫ ПЯТНІЦА 28.10

Фота Кастуся Дробава.

Падчас вечара памяці.

Сустрэча адбылася ў Дзяржаўным літаратурным мемарыяльным музеі Якуба Коласа, — і гэта не выпадкова, як заўважыў падчас выступлення старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч: у 1978 годзе Іван Пташнікаў стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа. Пісьменнік атрымаў узнагароду за аповесць «Найдорф».

Тэма вайны ў творчасці Івана Пташнікава займае асаблівае месца — ён належыць да пакалення дзяцей, у якіх вайна адабрала маленства, якія ведаюць не па чутках пра трагедыю спаленых разам з людзьмі вёсак, партызанскую барацьбу супраць акупантаў.

Творы пісьменнікаў, якія бачылі вайну дзіцячымі вачыма, далі новую хвалю асэнсавання перажытага, і роля Івана Пташнікава, як упэўнена Марыя Захарэвіч, сярод іх незаменная…

Анатоль Бутэвіч падкрэсліў, што другая важная тэма прозы Івана Пташнікава — сялянскае вясковае жыц[illegible]

[illegible]азважаў пра адметнасць у падачы з'яў[illegible]чыю, якая сведчыць пра тагачасныя [illegible]чікава:

[illegible]абляў не толькі людзей, але і пры[illegible] — прырода выступае ў яго як герой [illegible] з іншымі. Адметная роля Пташнікава і як [illegible] часопіса «Полымя»: ён здолеў многіх падтры[illegible], шмат каго і «выпусціў» у літаратуру на працягу [illegible] гадоў працы.

Пра тое, што ў айчынным пісьменстве ёсць шмат імёнаў, якія ўражваюць сваім маштабным светапоглядам, пільным узіраннем у вясковае жыццё, разважаў Алесь Карлюкевіч. Ён заўважыў, што спроба разглядзець кнігу як з'яву дапамагае ў шматлікіх мітрэнгах сённяшняга дня.

— Дапамагаюць у гэтым і з'явы, што засталіся мастацкімі здабыткамі ва ўчарашнім часе. Сваім святлом яны сягаюць і да нас сённяшніх. Іван Пташнікаў выклаў гэтае святло па-асаблівому: праз жаданне ўгледзецца ў душу простага чалавека, — падзяліўся думкамі старшыня СПБ. — Пра нашу літаратуру гавораць, што яна вясковая, бо асноўныя сюжэты і мастацкія архетыпы ў ёй з жыцця вяскоўцаў. Але калі б вы ўважліва перачыталі тое, што прыўнёс у літаратуру Пташнікаў праз узіранне ва ўласнае жыццё і ў жыццё сваіх блізкіх, зразумелі б, што гэта не простае жаданне паказаць беларускую вёску і асяроддзе, але і спроба зазірнуць у касмічны лёс чалавека з усімі яго памкненнямі, марамі, фантазіямі.

Іван Пташнікаў, як перакананы Алесь Карлюкевіч, паказаў сябе чалавекам, здольным космас асобы зрабіць маштабным, планетарным. Творца змог разгледзець рэчы, звязаныя з верай і духоўным святлом чалавека, і перадаць чытачам.

Успамінамі пра пісьменніка як калегу па літаратурным цэху і супрацоўніка рэдакцыі часопіса «Полымя» падзяліўся Генадзь Пашкоў. Ён згадваў, што Іван Пташнікаў быў вельмі стрыманым, маўклівым, сціплым у побыце, не любіў вечарынак з чаркамі, і ў той жа час заставаўся загадкавым.

Госцем на вечары памяці была і дачка пісьменніка Тацяна Іванаўна. Яна распавядала пра дзяцінства, выхаванне, пра тое, наколькі балюча ёй было ўспрымаць творы бацькі, бо ведала, якія факты стаялі за радкамі яго расповедаў.

Марыя ЯРАШЭВІЧ

з нагоды

Віншаван[illegible] таджыкска[illegible]у

НАВІНЫ ПАНЯДЗЕЛАК

Радасная навіна прыйшла з Таджыкістана: наш калега, дарэчы, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Ато Хамдам стаў на[illegible]ным пісьменнікам Таджы[illegible]. Днямі ўказ з гэтай на[illegible] саў Прэзідэнт Таджы[illegible] малі Рахмон.

Ато Хамдам [illegible] публіцыст. У Ду[illegible]дах свету выдадзе[illegible] Цыкл гістарычны[illegible]ных з лёсам слав[illegible]ачураў сучас[illegible]дзвіг [illegible] нашага [illegible]ракладзе на [illegible]укаваліся ў часо[illegible], газеце «Літаратура [illegible]». Перакладчыкам многіх [illegible]ступала беларуская пісьменні[illegible]рына Качаткова.

Дзякуючы намаганням Ато Хамдама ў Таджыкістане пабачыў свет цэлы шэраг кніг айчынных аўтараў — [illegible]а Марчука, Алеся Бадака, Міколы [illegible]ятліцкага, Мікалая Чаргінца, Юрыя Сапажкова, анталогія твораў сучаснай беларускай прозы і сучаснай беларускай паэзіі «Вячэрняе вогнішча». Ато Хамдама па праве можна называць паўнамоцным прадстаўніком беларускай літаратуры ў Таджыкістане.

Саюз пісьменнікаў Беларусі адправіў у Таджыкістан афіцыйнае віншаванне Ато Хамдаму з высокай адзнакай яго творчых здабыткаў, літаратурнай і грамадскай дзейнасці.

Сяргей ШЫЧКО

Сэнс жыцця

У Брылёўскай сельскай бібліятэцы-клубе Магілёўскага раёна прайшла літаратурная імпрэза «Чалавек. Асоба. Творца», прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння Народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца.

Прысутныя пачулі аповед пра юбіляра і яго жыццёвы шлях, які заўсёды быў пазначаны бездакорным служэннем Айчыне — і калі ўсе сілы аддаваў міліцэйскай працы, і калі рызыкаваў жыццём пад спякотным афганскім небам, і калі займаўся важнымі дзяржаўнымі справамі. І гэты вялікі жыццёвы вопыт знайшоў сваё адлюстраванне ў шматлікіх кнігах, якія выйшлі з-пад пісьменніцкага пяра Мікалая Чаргінца. Падчас сустрэчы чытач бібліятэкі Мікалай Яцкоў падзяліўся ўспамінамі аб сустрэчах з Мікалаем Іванавічам.

Да юбілею ў кніжніцы падрыхтавалі біяграфічны буклет і аформілі кніжную выстаўку, дзе можна было пабачыць і выданні з дарчымі надпісамі М. Чаргінца чытачам Брылёўскай бібліятэкі.

Юлія ЯЦКОВА

Неабходна памятаць

Творчую сустрэчу ў рамках Года гістарычнай памяці, Года класічнай літаратуры і чытання на Гомельшчыне, а таксама ў гонар 25-годдзя з дня заснавання Гомельскай пагранічнай групы з яе асабовым складам правёў заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы празаік і публіцыст Уладзімір Гаўрыловіч.

У фармаце ўрока патрыятызму і мужнасці шчырая размова пісьменніка і пагранічнікаў ішла аб неабходнасці захавання памяці папярэдніх пакаленняў, аб стварэнні нацыянальнай бяспекі нашай дзяржавы. Акцэнт рабіўся на гістарычных фактах і мастацкіх творах.

Ці маем мы права забываць трагічныя падзеі, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной? Літаратар упэўнены: не. Нішто не павінна быць забыта і страчана ў гістарычнай памяці нашага шматпакутнага народа.

З абаронцамі мяжы творца падзяліўся разважаннямі аб Бабруйскай крэпасці. На жаль, сёння не кожны грамадзянін рэспублікі згадае, што тут у гады вайны фашысты разгарнулі восем лагераў смерці. Дагэтуль спісаў аднаго з іх — лагера для ваенна-палонных і мірных жыхароў № 131 — так і не ўдалося знайсці — засталіся толькі страшныя пахаванні.

Няўжо з памяці народа такое можа знікнуць? Пісьменнік прывёў прыклад: кабардзіна-балкарцы шануюць памяць закатаванага ў засценках менавіта гэтага канцлагера вялікага паэта, філосафа, заснавальніка нацыянальнай культуры Алі Шагенцукава. Памятаюць і павінны памятаць аб страшнай трагедыі праз стагоддзі і новыя пакаленні славян, прадстаўнікоў усіх пацярпелых народаў СССР, ды рабіць усё магчымае, каб падобнае ніколі не паўтарылася.

Адбыліся невялікія прэзентацыі новых кніг пісьменніка — рамана «Па веры вашай...», зборнікаў аповесцей «Святая Параскева», «Анёлак мой, Анёлак…», у якіх Уладзімір Гаўрыловіч заклікае памятаць мінулае, каб будаваць шчаслівую будучыню. Шэраг выданняў аўтар падарыў бібліятэцы пагранічнай групы.

Кіраўнік пісьменніцкай арганізацыі Гомельшчыны распавёў пра дзесяцігоддзе сумесных перакладных праектаў беларусаў з растоўскімі і краснадарскімі пісьменнікамі ў рамках міжнародных літаратурных фестываляў «Славянскія літаратурныя Дажынкі» і «Берагі дружбы», прадставіў апошнія выданні вершаў у перакладах на рускую і беларускія мовы. Таксама ён прэзентаваў 7 і 8 нумар міжнароднага альманаха «Літара» і анталогію сучаснай сусветнай паэзіі «Зямля — наш агульны дом».

Дарэчы, абласное аддзяленне СПБ плённа супрацоўнічае з Гомельскай пагранічнай групай. Толькі сёлета праведзена больш за 10 творчых сустрэч, урокаў мужнасці і патрыятызму з удзелам літаратараў вобласці. Дасягнута дамоўленасць і аб супрацоўніцтве на 2023 год.

Мікалай ІГНАТОВІЧ
Фота даслана аўтарам

Уславілі Яе Вялікасць Маці

У Мінскім гарадскім тэатры паэзіі, які працуе пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, адбыўся спектакль «Цалуйце рукі любыя матуль!», прысвечаны Дню маці. Аўтарам сцэнарыя, рэжысёрам і вядучай выступіла мастацкі кіраўнік Тэатра паэзіі Вольга Багушыньска.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел члены СПБ Міхась Пазнякоў, Алег Жукаў, Валянціна Драбышэўская, Тамара Кавальчук, а таксама артысты Тэатра паэзіі Ганна Красоўская і Святлана Яфрэмава. Песні на вершы беларускіх і рускіх паэтаў прагучалі ў выкананні барда Сяргея Бычкоўскага, вакальнага ансамбля «Кветкі Беларусі» факультэта эстэтычнага выхавання БДПУ імя Максіма Танка (мастацкі кіраўнік — член СПБ Тамара Кавалёнак), народнага артыста Беларусі, члена СПБ Эдуарда Ханка.

У зале была разгорнута вялікая кніжная выстаўка, прысвечаная тэме маці, роднаму краю, Беларусі, падрыхтаваная супрацоўнікамі бібліятэкі.

Павел КУЗЬМІЧ

Мінскае гарадское аддзяленне грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру» праводзіць першы Мінскі гарадскі фестываль-злёт сямей «Дружная сям'я — моцная краіна» ў фармаце прадстаўлення радаводу, арганізаваны сумесна з камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта і Мінскага гарадскога камітэта ГА «БРСМ».

Мэтай злёта стане ўмацаванне сямейных каштоўнасцей і традыцый пераемнасці пакаленняў, генеалагічнага радаводу і выхаванне паважлівага стаўлення да сямейных сувязей.

Усяго ў фестывалі-злёце прымае ўдзел 9 сямей з усіх раёнаў горада з колькасцю ўдзельнікаў ад 6 да 10 членаў сям'і.

Мерапрыемства складаецца з прэзентацыі сям'і, сцэнічнага творчага нумара сям'і, бліц-конкурсаў членаў сям'і і капітанаў сям'і, выступленняў мастацкіх калектываў і салістаў Школ міру сталіцы.

Фестываль-злёт адбудзецца 1 лістапада ў 14.00 у Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў.

«ЛіМ»-люстэрка

Вялікі тэатр Беларусі адправіўся на гастролі ў Маскву. На сцэне Вялікага тэатра Расіі прадстаўляюць два знакавыя спектаклі з рэпертуару тэатра: нацыянальную оперу «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Солтана ў пастаноўцы Ганны Маторнай і балет «Шчаўкунок» Пятра Чайкоўскага ў пастаноўцы Валянціна Елізар'ева. Выступленне калектыву Вялікага тэатра Беларусі ў Маскве на сцэне Вялікага тэатра Расіі праходзіць у рамках абменных гастролей паміж двума калектывамі. Запланавана, што Вялікі тэатр Расіі выступіць у Мінску ў лістападзе 2023 года таксама з двума спектаклямі — операй «Барыс Гадуноў» Мадэста Мусаргскага і балетам «Чайка» Ільі Дзямуцкага, перадае БелТА.

Беларуская дэлегацыя прывезла 7 медалёў і 2 дыпломы з XVI маладзёжных Дэльфійскіх гульняў дзяржаў — удзельніц СНД, якія прайшлі з 14 да 18 кастрычніка ў Душанбэ (Таджыкістан), паведамляе БелТА са спасылкай на тэлеграм-канал Міністэрства культуры. У прыватнасці, беларуская зборная вярнулася з 1 залатым, 5 сярэбранымі і 1 бронзавым медалямі. «Золата» ў намінацыі «Духавыя інструменты» заваяваў Аляксей Іардасопаль, «серабро» ў намінацыі «Эстрадныя спевы» — Алена Кузняцова, у намінацыі «Народны танец» — ансамбль кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Сярэбраным медалём у намінацыі «Фартэпіяна» ўзнагародзілі Любоў Глазаву, у намінацыі «Скрыпка» — Цімура Нікіценку, у намінацыі «Выяўленчае мастацтва» — Марту Шчэрбіч. «Бронзы» ў намінацыі «Акадэмічныя спевы» ўдастоена Марыя Шыдлоўская, дыплома ў намінацыі «Сольныя народныя спевы» — Дар'я Дзянісава, дыплом у намінацыі «Мастацкія рамёствы» атрымала Людміла Кірылава.

Рэліквіі Беларусі прадстаўлены ў Новай Александрыйскай бібліятэцы ў Егіпце. Аб арганізацыі пастаяннай экспазіцыі ў сценах адной з самых вядомых бібліятэк свету дамовілася Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, інфармуе агенцтва «Мінск-Навіны». У склад калекцыі, што прадстаўлена ў Новай Александрыйскай бібліятэцы, уваходзяць 12 мініяцюрных копій рэдкіх друкаваных выданняў вядомых беларускіх класікаў — Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Францыска Скарыны. Таксама ўключаны арабаграфічныя рукапісы, кітабы, — рукапісныя кнігі беларускіх мусульман, аўтографы знакамітых творцаў. Як адзначыў дырэктар Новай Александрыйскай бібліятэкі Ахмед Абдала Заед, мерапрыемства для бібліятэкі значнае, паколькі гэта не проста месца, дзе захоўваюцца кнігі, а маштабны цэнтр для прадстаўлення культуры розных краін. Цяпер будзе працаваць своеасаблівая міні-бібліятэка Беларусі ў Александрыі.

Кіраўнікі замежных беларускіх калектываў мастацкай творчасці і грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа праходзяць у Беларусі творчую стажыроўку, паведамляе БелТА. Як адзначыў міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч падчас сустрэчы з гасцямі, добрая традыцыя праводзіць творчыя стажыроўкі існуе з 2016 года: «Мы бачым, што яны вельмі запатрабаваны прадстаўнікамі беларускай дыяспары. Геаграфія ўдзельнікаў шырокая, і мы ганарымся тым, што з кожным годам палітра краін прырастае». Праграма стажыроўкі сфарміравана такім чынам, каб яе ўдзельнікі адкрылі для сябе новыя старонкі гісторыі і культуры Беларусі, прывезлі дадому шмат яркіх уражанняў і ведаў. У ёй прымаюць удзел 39 чалавек з Італіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, ЗША, Расіі, Эстоніі ды іншых краін.

Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску плануюць правесці з 23 да 27 лістапада пасля двухгадовага перапынку. Асноўная падзея форуму — міжнародны конкурс. У адборачным відэатуры была прадстаўлена 51 заяўка з Беларусі, Расіі, Казахстана і Арменіі. Прайшлі гэты этап 22 калектывы, ім прапанавана прыняць далейшы ўдзел у конкурсе. Праграму Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі дапоўняць выстаўкі жывапісу і фатаграфій, майстар-класы і іншыя сустрэчы розных фарматаў, гаворыцца ў матэрыяле БелТА.

Анлайн-сэрвіс *Netflix* здыме серыял паводле культавага рамана Габрыэля Гарсія Маркеса «Сто гадоў адзіноты». Сэрвіс на старонцы ў *YouTube* апублікаваў ролік, у якім прадстаўлены дэкарацыі для горада Маконда. Менавіта там у кнізе разгортваліся асноўныя падзеі. Здымкі пройдуць у Калумбіі. Да работы над серыялам прыцягнуты сыны пісьменніка — Радрыга Гарсія і Гансала Гарсія Барча, удакладняе РІА «Новости». Дата прэм'еры пакуль не называецца. Раман «Сто гадоў адзіноты» выйшаў у 1967 годзе. Ён напісаны ў жанры магічнага рэалізму.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Максім МІСЬКО:

«У Фонд міру р[illegible]адковыя людзі не [illegible]юць»

РЭПАРТАЖ ПАНЯДЗЕЛАК

Мэты аднаго з найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў краіны — Беларускага фо[illegible] міру — ніколі не страчвалі сваёй а[illegible]насці: умацаванне міру, сяброўс[illegible] разумення, згоды паміж людзьмі распаўсюджванне і ператварэнне [illegible] ідэй міласэрнасці і гуманізму. Пра т[illegible] садзейнічае і спрыяе гэтым мэтам, п[illegible] якія стаяць перад аб'яднаннем, паразм[illegible] са старшынёй праўлення Беларускага ф[illegible]нду міру Максімам Місько.



Фота БелТА.

— Максім Уладзіміравіч, ці змяняюцца мэты і задачы Беларускага фонду міру ў сувязі з трагічнымі падзеямі апошняга часу? Вы казалі, што яны павінны трансфармавацца.

— Гэтага меркавання я прытрымліваюся і сёння. Чаму звяртаю на гэта ўвагу: Савецкі фонд міру традыцыйна выступаў за мір ва ўсім свеце. Мэта і звязаныя з ёй задачы, якія на сябе браў фонд, усё ж такі складаныя. Штосьці атрымлівалася здзейсніць, штосьці, натуральна, не. У незалежнай краіне задачы нашай арганізацыі выкрышталізаваліся: асноўная — мір і спакой у нашай краіне, і ўсё магчымае робім у першую чаргу для гэтага. Мажліва, гучыць не вельмі папулярна, але нас у большай ступені цікавіць дабрабыт нашых грамадзян. Гэта здаровае пачуццё любога патрыёта — калі ён клапоціцца найперш аб сваёй сям'і, аб калектыве, аб Радзіме. Між тым робіць гэта паслядоўна, пачынаючы з самога сябе. Таму і мы сёння канцэнтруемся не на вялікіх подзвігах, а на маленькіх добрых справах, якія ўдаецца рабіць «фонду нашых сэрцаў». Часта сябе так называем.

— Вялікія дасягненні складаюцца з маленькіх перамог?

— Добры рэзультат, здавалася б, невялічкай справы — гэта вялікая перамога. Часта звяртаем увагу на тое, што паняцце міру вельмі шматзначнае, таму і нашы мэты і задачы разнастайныя. Гэта ў тым ліку падтрымка Беларусі на міжнароднай арэне, дзе наш голас у рамках народнай дыпламатыі сур'ёзны, істотны. Да яго прыслухоўваюцца, бо гаворым ад імя народа. Фонд міру — зрэз усяго беларускага грамадства: у праўленне, напрыклад, уваходзяць людзі розных прафесій, рознага веравызнання, розных нацыянальнасцей. Толькі параіўшыся, можам рабіць тыя ці іншыя заявы да міжнароднай супольнасці.

— Калі аналізуеце дзейнасць арганізацыі, пра што думаеце ў першую чаргу?

— Наша асноўнае памкненне сёння — выклікаць і ў дзяцей, і ў дарослых пачуццё міласэрнасці. Яно ўласціва многім, аднак для выяўлення неабходны штуршок, для нас гэта значыць — даць магчымасць паўдзельнічаць у сумесным занятку, дапамагчы чалавеку адчуць сябе прыналежным да добрай справы. Стасункі паміж людзьмі — скрэпа, якая дазваляе жыць усім нам як адна сям'я.

— Што лічыце найважнейшым дасягненнем Беларускага фонду міру за апошні час?

— Фонд — надзейны памочнік у рэалізацыі сацыяльнай палітыкі. На маю думку, сёння мае вагу тая грамадская арганізацыя, якая не просіць фінансавай падтрымкі ў дзяржавы, а служыць ёй падмогай. Спектр тых, каму мы дапамагаем, вельмі шырокі: ад самых маленькіх да людзей старэйшага пакалення. Яркае пацвярджэнне — 8 дамоў дзіцяці па ўсёй краіне, якія знаходзяцца пад нашай апекай, дапамога дзіцячым дамам сямейнага тыпу, установам аховы здароўя (падтрымка персаналу, удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы), у тым ліку ўладкаванне палат для ветэранаў вайны і працы. Важны кірунак — работа з дзецьмі і моладдзю, у прыватнасці конкурсы для школьнікаў, дзякуючы якім можам падштурхнуць іх да разважанняў.

— Нядаўні конкурс «Мір у душы — мір у краіне!» якраз з такіх. Раскажыце, калі ласка, пра ідэю і яе ажыццяўленне.

— З 2017 да 2019 года ў нас праводзіўся падобны конкурс, аднак быў ён вузкаскіраваны — кожны год разглядалі асобны кірунак творчасці: вершаскладанне, прозу і жывапіс. Першая трылогія пад назвай «Дзеці за мір» пабачыла свет у 2019 годзе. Тэма тады гучала так: «Шчасце жыць у мірнай краіне».

Сёлета мы адчулі, што час сціскаецца, і ў рамках міратворчай дзейнасці вырашылі працаваць болей актыўна, аб'яднаўшы тры намінацыі ў адным конкурсе. Агульная тэма — «Мір у душы — мір у краіне». У палажэнні мы зафіксавалі такі момант: хацелі, каб дзеці ў сваіх творах паказалі прыгажосць душы беларускага народа, у тым ліку праз прызму хрысціянскіх каштоўнасцей. Так сфарміравалася трыа сузаснавальнікаў конкурсу: Беларускі фонд міру, Міністэрства адукацыі і Беларуская праваслаўная царква. Тэматыка кнігі малюнкаў паўстала сама сабой — хрысціянскія храмы. Юныя мастакі ахапілі кожны раён Беларусі. Лічу альбом унікальным выданнем, гэта сапраўдная жамчужына серыі.

Паэтычныя спробы дзяцей вельмі прачулыя. Для нас, дарослых, ёсць пэўнае заспакаенне ў тым, як дзеці адчуваюць сябе ўнутры сённяшняй Беларусі. Як яны радуюцца таму, што ў нас мір і спакой, як цэняць гэта і як пра гэта пішуць… Усе ўдзельнікі таленавітыя. Натуральна, для многіх конкурс — сур'ёзны зачын для будучай творчасці, таму што не ва ўсіх дарослых пісьменнікаў ёсць выдадзеныя кнігі. Між іншым, што тычыцца прозы і паэзіі, то творы як беларускамоўныя, так і рускамоўныя, хоць першы блок пераважае, і гэта радуе.

— Чым ініцыятыва карысная для Беларускага фонду міру? Арганізаваць конкурс, прааналізаваць вынікі, выдаць некалькі кніг — справа нялёгкая і энергаёмістая.

— Для гэтага і працуем. Не ў апошнюю чаргу для нас важны ахоп удзельнікаў — імі сталі 10 тысяч дзяцей, і кожнага з іх у выніку мы не абдзялілі ўвагай. Ды ў склад журы ўвайшлі знакамітыя пісьменнікі і мастакі. Да таго ж самі работы — папулярызацыя ідэй мірнай краіны, таму і назва трылогіі такая — «Краіна міру». Галоўнае, што мы хацелі даведацца: як дзеці бачаць жыццё ў нашай краіне. І, як помнім, вуснамі немаўляці прамаўляе ісціна. Такой шчырасцю хацелі падзяліцца і мы. Так, узнагароджанне пераможцаў праходзіла крыху нефармальна — ганаровыя госці выходзілі на сцэну і чыталі тыя вершы, якія ім найбольш спадабаліся.

— Колькі часу спатрэбілася на арганізацыю конкурсу і які працяг ён можа займець?

— Праца заняла паўгода. Дарэчы, у найбліжэйшы час у некаторых сродках масавай інфармацыі паспрабуем нейкім чынам «падсвяціць» зорачак — маленькіх і больш дарослых творцаў. Спаборніцтва ў такім фармаце плануем праводзіць кожны год, мяняючы толькі тэмы для роздумаў, выпускаць трылогіі. А тэм шмат — разам з партнёрамі, думаю, атрымаецца знайсці матывы, здольныя закрануць тыя ці іншыя стрункі душы. Менавіта такія садзейнічаюць сапраўднаму патрыятычнаму выхаванню. А эфектыўным яно будзе толькі ў выпадку шчырай размовы з дзіцем праз літаратуру і мастацтва.

— Якія праекты ў сферы культуры, мастацтва лічыце найбольш важнымі?

— Наша праграма «Мір праз культуру» — адна з базавых. Не так даўно правялі Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, дапамаглі арганізаваць першы ў Беларусі турнір халяльнай кухні… Аднак з асаблівай цеплынёй успамінаю мінулагодні канцэрт «Любімыя мелодыі ваенных гадоў» пад кіраўніцтвам шаноўнага Аляксандра Анісімава, які мы зладзілі напярэдадні Дня Перамогі ў Белдзяржфілармоніі. Тады Фонд міру зрабіў падарунак ветэранам вайны і працы з усёй рэспублікі. На працягу пяці гадоў дзейнічае і працягнецца ў будучыні праект па ўсталяванні стэндаў памяці «У страі заўсёды, у памяці навечна» ва ўстановах рознага тыпу. Летась скончылі будаўніцтва мемарыяла ва ўрочышчы Пяскі. Стварыўся ён усім светам цэлых 10 гадоў, аднак справа была вартая чакання. Увогуле, шмат супрацоўнічаем з міністэрствамі — адукацыі, культуры, інфармацыі.

— Дарэчы, цікавы кірунак вашай дзейнасці — «Сетка Школ міру ў Рэспубліцы Беларусь».

— Так, гэта інавацыйны праект пазакласнай работы са школьнікамі. Прадугледжваецца, што актыўнасць вучняў накіравана на гуманітарную, дабрачынную дзейнасць, на ўдзел у тых сацыяльных праграмах, якімі актыўна займаецца Фонд міру ў дадзены момант. Сумесна з Міністэрствам адукацыі распрацавана палажэнне аб тым, як школа можа ўступіць у праект і якой павінна быць актыўнасць яе навучэнцаў, каб захаваць статус «Школы міру». Такое званне даецца на адзін год, у канцы якога ўстанова адукацыі інфармуе аб дабрачынных, гуманітарных, сацыяльных, міратворчых, экалагічных ініцыятывах школьнікаў. Пасля мы і прымаем рашэнне, ці захаваць статус. Дарэчы, вельмі складана арганізаваць работу з усімі навучальнымі ўстановамі краіны. Разумелі, што, калі сфарміруем базу школ кожнага раёна, супрацоўніцтва атрымаецца. Сёння ў сетцы болей як 100 школ, аднак запыт на ўдзел у праекце большы, чым мы пакуль можам пракантраляваць.

— Летась Беларускаму фонду міру споўнілася 60 гадоў. Ці не думалі сістэматызаваць звесткі пра яго? Маю на ўвазе перспектыву выдання кнігі, прысвечанай гісторыі арганізацыі.

— Зараз у распрацоўцы матэрыялы публіцыста і пісьменніка Міхаіла Шыманскага, намесніка старшыні праўлення нашай арганізацыі. Доўгія гады ён публікаваў артыкулы, прысвечаныя і ваеннаму перыяду, і мірнай Беларусі, якія перадаў фонду. Справа засталася за выданнем. У выніку павінен атрымацца зборнік успамінаў з 28 раздзелаў пад назвай «Усюды была вайна». Звесткі пра Фонд міру — частка будучай кнігі.

— З якімі цяжкасцямі сутыкаецеся апошнім часам?

— Скардзіцца няма на што. У нас вельмі добрая каманда — у Фонд міру выпадковыя людзі не трапляюць. Аднак ёсць адна нязменная складанасць — збіраць грошы, а без гэтага нікуды. Сярод супрацоўнікаў гуляе жарт, што ў нас ва ўсіх адна рука стала даўжэйшай за другую. Аднак адказваем на нязручныя пытанні, даказваем, хто, дзе і чаму мае патрэбу ў дапамозе. Беларускі фонд міру падтрымліваюць вельмі буйныя кампаніі, бо вераць у нас і бачаць вынікі. Увогуле, болей за мільён чалавек спрычыняецца да дзейнасці фонду. Складана ўявіць!

Між тым відаць, што апошнім часам людзі сталі паіншаму ўспрымаць само слова «мір». Колькасць членаў арганізацыі за гэты год вырасла не ў два і нават не ў тры разы… Людзі імкнуцца быць хоць нечым карыснымі. Кожнага з нас не можа не трывожыць адсутнасць міру і спакою на знешніх граніцах, ва ўсім свеце наогул. Упэўнены, што вельмі шмат беларусаў, сапраўдных патрыётаў, дзеля міру гатовы ахвяраваць сваім жыццём. Аднак не ўсё залежыць ад нас. Застаецца займацца сваёй справай яшчэ болей сур'ёзна, адказна і добрасумленна і захоўваць сваё сэрца — яно не павінна ператварыцца ў камень. Трэба помніць словы Іаана Златавуста, якімі і я ратуюся: нельга любіць аднаго і ненавідзець другога. Гэта не ёсць хрысціянская любоў.

— Максім Уладзіміравіч, у полі вашай увагі пастаянна знаходзяцца пытанні, звязаныя з мірам, справядлівасцю, міласэрнасцю… У гэтай сувязі ці можаце расказаць, да якіх твораў літаратуры ці мастацтва часцей звяртаецеся? Што маглі б параіць?

— Гэта вельмі доўгі спіс. Аднак менавіта сёння падабаецца вяртацца да даволі складаных філасофскіх твораў. Даспадобы творчасць Германа Гесэ, парэкамендаваў бы прачытаць «Гульню ў бісер» і шэраг іншых яго шэдэўраў. Можна ў наш час звярнуцца і да Жана-Поля Сартра з яго тэорыяй абсурду. Аднак чытаць іх трэба не з мэтай акунуць сябе ў дэпрэсію, а каб зразумець гэтыя работы і стаць вышэй за той самы абсурд. Альбо паспрачацца, напрыклад, з Альберам Камю наконт таго, ці вартае жыццё таго, каб яго пражыць… Калі ёсць сілы на тое, каб паразважаць і асэнсаваць нашу рэчаіснасць, то можна знайсці адказы на важныя пытанні і зрабіць сур'ёзныя пазітыўныя высновы. Параіў бы ўсім прачытаць ці перачытаць класіку ўсіх часоў, адзін з наймудрэйшых твораў — «Казку пра рыбака і рыбку» Аляксандра Пушкіна. Для тых, хто асэнсуе яе, жыццё стане больш радасным.

Гутарыла Яўгенія ШЫЦЬКА

МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНА ФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД

КІНО АЎТОРАК

Сапраў[illegible] каштоўнасці

XXVIII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» пройдзе ў сталіцы Беларусі 4—11 лістапада. Гледачы змогуць убачыць найлепшыя стужкі апошняга года. На прэс-канферэнцыі, прысвечанай мерапрыемству, арганізатары падзяліліся планамі, прэзентавалі праграму і адкрылі некаторыя з таямніц галоўнага фестывалю краіны.

Заснаваны Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у 1994 годзе, «Лістапад» меркаваўся як кінафорум краін СНД і Балтыі. Планавалася, што будуць дэманстравацца стужкі, якія з пэўных прычын не траплялі ў шырокі пракат, але адлюстроўвалі культуру той ці іншай краіны. Аднак за гады існавання кінафестываль набыў значны аўтарытэт дзякуючы агульнаму ўзроўню правядзення і адбору фільмаў. І ўжо ў 2003-м афіцыйна стаў міжнародным.

Арганізатары «Лістапада» — Міністэрства культуры, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Дырэкцыяй фестывалю прызначана Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» на чале з генеральным дырэктарам Уладзімірам Карачэўскім.

— Быў створаны арганізацыйны камітэт пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі. Пасяджэнні збіраюцца рэгулярна, — падзялілася намеснік начальніка аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Ганна Нікіціна. — На чарговым пасяджэнні, праведзеным 10 кастрычніка, зацверджаны слоган сёлетняга фестывалю — «Сапраўдныя каштоўнасці».

Менавіта аргкамітэтам былі абраны склады журы ўсіх конкурсных праграм і візуальнае вырашэнне кінафестывалю.

Фота з архіва БелТА.

— З 1994 года саюз кінематаграфістаў прымае актыўны ўдзел у праграме «Лістапада», і гэта нязменна. Удзельнічаем не толькі ў конкурсах, але і ў разнастайных майстар-класах, творчых сустрэчах і запрашаем гасцей.

Сёлета Саюз кінематаграфістаў адзначае 60-годдзе свайго існавання. Створанае ў лістападзе 1962 года на 1-м устаноўчым сходзе кінематаграфістаў БССР творчае аб'яднанне зрабіла значны ўнёсак у беларускую культуру.

У сувязі з гэтым 5 лістапада ў Тэатры-студыі кінаакцёра адбудзецца ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае юбілею арганізацыі.

Распавёў аб фестывальным настроі і народны артыст Беларусі, старшыня XXVIII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» Аляксандр Яфрэмаў.

— Спадзяюся, сёлетні «Лістапад» будзе адрозніваецца ад усіх папярэдніх праграмы, у тым ліку і «Лістападзік», — распавёў журналістам начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віталь Брэль. — Таксама ідзе ўзгадненне месцаў у горадзе, дзе плануецца размясціць рэкламу і адмысловыя п[illegible]цоўкі, звязаныя з фестывалем.

Віктар Васільеў, савецкі [illegible] акцёр, старшыня Белар[illegible] нематаграфістаў, [illegible] творчага аб'яд[illegible] і поўнае жыццё. Менавіта кінематограф павінен па[illegible]ттурхнуць гледача пачаць жыць. [illegible]ыць жыць. Мне хочацца ве[illegible]ся праграма фестыва[illegible]чана нашаму гледачу [illegible]о, што жыццё вартае,

[illegible]ўскі, генеральны [illegible]альнай кінастудыі [illegible]м», дырэктар фестыва[illegible]ыў:

— Сёлета сусветна вядомы фестываль «Лістапад» паказаў вялікі рост. Аб гэтым сведчаць лічбы: 1360 заявак з 89 краін. Летась было каля 300. Гэта нельга ігнараваць. І цяпер 300 заявак толькі на асноўны конкурс «Ігравое кіно».

Фестываль для кінастудыі ўжо не з'яўляецца чымсьці новым. «Беларусьфільм» на працягу года плённа і адказна рыхтаваўся да гэтай падзеі. Калі ў мінулым годзе быў першы пробны крок, ўсё заставалася незразумелым. Але цяпер усё адназначна: кінастудыя з камандай належна справілася з задачай і конкурс меў рэзананас. Было прадстаўлена больш за 100 фільмаў у розных конкурсных і пазаконкурсных праграмах.

Ацэньваць кожную з праграм будуць прафесіяналы. Так, старшынёй журы конкурсу ігравога кіно стаў расійскі акцёр, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва Дзмітрый Астрахан. Таксама ў судзейскую каманду ўвайшлі генеральны дырэктар кінакампаніі «Каро-Прэм'ер» Аляксей Разанцаў і кінакрытык Людміла Саянкова.

Дакументальнае кіно будзе судзіць запрошаны сербскі сцэнарыст і прадзюсар Ёван Маркавіч.

Ігар Волчак, беларускі мультыплікатар, сцэнарыст і кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, узначаліць журы конкурсу анімацыйных фільмаў. Таксама ў яго рабоце плануецца ўдзел Дзяніса Чарнова, рэжысёра «Смяшарыкаў», і Махамеда Газалы, рэжысёра-мультыплікатара, загадчыка кафедры візуальнай і лічбавай вытворчасці Універсітэта Эфат у Саудаўскай Аравіі. Старшынёй журы «Лістападзіка» стане генеральны дырэктар кінастудыі «Таджыкфільм» Махмадсаід Шахіён. У гэтым годзе ў складзе судзейскай каманды абавязкова прысутнасць прадстаўнікоў Беларусі.

Уладзімір Карачэўскі прадставіў журналістам і праграмных дырэктараў кожнай з конкурсных праграм:

— Намі была сабрана прафесійная і дасведчаная каманда праграмных дырэктараў, якія, безумоўна, з'яўляюцца экспертамі ў тых галінах кінематографа, за якія ўзялі адказнасць. Так, дырэктарам праграмы ігравога кіно стала Алена Радзевіч, дакументальных фільмаў — Сяргей Кац'ер. Сцэнарыст, аніматар Канстанцін Андрушачкін курыруе анімацыйную праграму. «Лістападзік» апякуецца вядомай сцэнарысткай і рэжысёркай Аленай Туравай. Плануецца прадставіць каля 60 фільмаў толькі ў конкурсных праграмах. Кінапракатчыкі краіны гатовы прыняць паказы на найвышэйшым узроўні.

Новым у гэтым годзе стане кіно маладзёжнае. Сустрэчы і паказы адбудуцца ва Універсітэце культуры, дзе будуць прадстаўлены кароткія метры маладых рэжысёраў. Акрамя ўсяго, там пройдзе пітчынг рэжысёрскіх эксплікацый, студэнцкіх работ, дзе можна будзе ўбачыць новыя цікавыя ідэі і бліжэй пазнаёміцца з маладымі аўтарамі краіны. Арганізатар мерапрыемства — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

— Нашай камандай запланавана правядзенне шэрагу майстар-класаў, творчых сустрэч і адукацыйных праграм, — адзначыў генеральны дырэктар «Беларусьфільма». — Вялікая ўвага надаецца працы з моладдзю, бо кінастудыя імкнецца да таго, каб больш маладых і юных гледачоў узяло ўдзел у разнастайных сустрэчах, семінарах, пітчынгах, праглядах. Таму што ў першую чаргу хочацца, каб фестываль быў патрэбны не толькі пастаянным прыхільнікам, але і нашай «змене».

Фестываль абяцае радаваць гледача шырокай пазаконкурснай праграмай. Перадусім Днямі кіно Расіі, Узбекістана, Кітая, Індыі, Інданезіі, Манголіі, Палесціны.

Чакаецца вялікая прэзентацыя беларускіх фільмаў: дырэкцыя фестывалю плануе прадставіць зробленае айчыннымі дзеячамі кіно за год. Беларускія кінематаграфісты возьмуць у мерапрыемстве актыўны ўдзел. Дзякуючы іх дапамозе, запланавана некалькі спецпрэм'ер у межах «Лістапада». Акрамя беларускіх аўтараў, чакаецца вялікая колькасць зорак сусветнай велічыні, вядомых гасцей і медыйных персон, якія паўдзельнічаюць у адкрыцці і закрыцці фестывалю, а таксама правядуць асабістыя сустрэчы.

Дзякуючы дырэктарам нацыянальных кінастудый была створана «Залатая калекцыя краін СНД». Фільмы з яе прадставяць у межах «Лістапада». У планах арганізатараў — паказаць іх не толькі ў сталіцы, але і ў іншых гарадах Беларусі.

Дзелавая праграма фестывалю не менш насычаная, чым конкурсная. У раскладзе — круглыя сталы з прадзюсерамі і экспертамі з розных краін, дзе абмяркуюць актуальныя праблемы кінематографа. Чакаюцца падпісанні дагавораў аб супрацоўніцтве нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» з тэлеканаламі і студыямі іншых краін.

— Мы прыкладаем намаганні для таго, каб кіно, якое трапіць на фестываль, не адбірала ў людзей надзею. У кожным фільме хочацца пакінуць гледачу веру ў светлае. Стужкі будуць разнастайныя, але гаварыць збіраемся аб галоўным і вечным. Аб сапраўдных каштоўсцях, бо гэта як ніколі актуальна.

У перыяд правядзення фестывалю арганізатары абяцаюць максімальна падрабязна асвятляць падзею ў сацыяльных сетках.

Акадэмія мастацтваў, БДУКМ, Акадэмія музыкі, факультэт журналістыкі БДУ, МДЛУ, БРСМ і грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» накіруюць валанцёрскія каманды для дапамогі ў правядзенні фестывалю.

Яна ЦЭГЛА

Кадр з анімацыйнага фільма «Класікі і шахматы».

У найбліжэйшы час распачнецца шырокая рэкламная кампанія. Галоўным інфармацыйным партнёрам «Лістапада» стала Белтэлерадыёкампанія.

— Месцы правядзення застаюцца нязменнымі: кінатэатр «Масква» прыме цырымоніі адкрыцця і закрыцця. Кінатэатры «Беларусь», «Цэнтральны», «Піянер» пакажуць сёлетнія асноўныя не толькі тым, што ўпершыню ў нас такая вялізарная колькасць краін-удзельніц, але і надзвычай эфектыўнай працай на экране. Чакаем карціны, якія зацікавяць гледача! Сацыёлагі сцвярджаюць, што мы змяніліся. Мы — грамадства. Калі раней на экране былі цемра і разруха, то цяпер глядач чакае героя, які пражывае шчаслівае

Спадчына Якуба Коласа — найкаштоўнейшы мастацка-эстэтычны скарб і невычэрпная крыніца глыбіннай мудрасці народа. Творчае сталенне пісьменніка адбывалася на пачатку XX ст., калі гальванізаваліся працэсы фарміравання беларускай нацыі, актывізаваліся духоўныя і творчыя сілы народа. Розумам і сэрцам Якуб Колас адчуваў патрэбы часу, актыўна рэагаваў на сацыяльныя змены і бягучыя палітычныя падзеі, абуджаў памкненні да лепшага, імкнуўся да дабрыні, гуманізму і грамадскага паразумення.

Літаратурны талент выдатнага майстра слова сфарміраваўся пад уздзеяннем вуснай народнай творчасці, беларускай літаратуры XIX ст., твораў Ф. Багушэвіча і В. Дуніна-Марцінкевіча, польскай, рускай і сусветнай класікі [illegible] маштабна выявіўся на ніве паэзіі і прозы, драматургіі ды публіцыст[illegible]мі шырокім дыяпазоне жанравых форм.

ЛІТАРАТУРА ЧАЦВЕР

Феноменальная з’ява нацыянальнай культуры

Патрыятычны і грамадзянскі пафас

Якуб Колас — глыбока народны і сацыяльны паэт, пісьменніцкі шлях якога пачаўся ў 1906 г. з публікацыі праграмнага твора «Наш родны край». Праз некалькі гадоў выйшаў першы паэтычны зборнік «Песні жальбы» (1910), у якім аўтар выразна акрэсліў уласную творчую місію — праўдзіва распавядаць пра Бацькаўшчыну, мастацкім словам служыць беларускаму народу, выяўляць і паказваць адвечныя мары і памкненні беларусаў.

Паэзія Якуба Коласа палітычна завостраная. Яго заўжды хвалявалі надзённыя грамадскія праблемы, непакоіў лёс і гістарычныя перспектывы беларускай нацыі, будучыня роднага краю, становішча працоўнага чалавека. Вершаванае слова, перадусім, скіраваў супраць царскага самаўладдзя, нялюдскай і крывавжэрнай імперскай палітыкі расійскіх манархаў. У вершы «Мікалаю ІІ», напісаным з нагоды разгону Думы, выкрывае хлусліваю і антынародную палітыку цара, які кіруецца не клопатам пра народ і яго дабрабыт, а толькі ўласнымі непамернымі палітычнымі амбіцыямі.

У вершы «Вобраз самаўладдзя» паэт выступае як духоўны лідар беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, адкрыты змагар з царскім паліцэйскім рэжымам. Верш «Канстытуцыя» высмейвае ўрад і яго міністраў, якія на паперы абвясцілі правы і свабоды для людзей, а на справе ўзмацнілі ціск на працоўны люд: «У астрог нас павялі // І таўкуць без меры».

Якуб Колас рэзка выступіў супраць сацыяльнай няроўнасці, несправядлівага размеркавання ўласнасці, класавага падаўлення працоўнага люду, здзеку з чалавечай асобы. Асабліва выразна антаганізм паміж багатымі і беднымі паказаны ў вершы «Ворагам». У ім асуджаецца няшчаднае рабаванне працоўных людзей, паэт папярэджвае пра хуткі час расплаты над бязлітаснымі «багацеямі і панствам». У вершы «Покліч» песняр адкрыта заклікае да супраціву, барацьбы за сацыяльныя, нацыянальныя і палітычныя правы, «змаганне за шчасце, за лепшую долю».

Народны паэт смела паказваў жахлівыя ўмовы існавання звычайнага беларуса, гаротны стан яго жыцця, беднасць, прыгнечанасць, адвечны клопат пра хлеб надзённы. У вершах «Мужычае жыццё», «Наша доля», «Вёска», «Доля батрачкі» створаны каларытныя малюнкі незлічоных пакут прыгнечанага народа, паказаны беды і слёзы пакрыўджаных, з якіх высмоктваюць апошнія сокі. У вершы «У астрозе» Колас выступае ў абарону абяздоленых і бяспраўных людзей, кінутых у астрогі, дзе няшчасныя зняволеныя пакутуюць ад невыноснай адзіноты, тугі і здзекаў.

Разам з тым, добра дасведчаны ў гістарычнай сітуацыі і жыццёвых рэаліях, паэт аптымістычна глядзіць на перспектывы беларускай нацыі, верыць у абуджэнне глыбіннай стваральнай моцы народа. Верш «Беларусам» — красамоўнае пацвярджэнне Коласавай перакананасці ў адраджэнні Беларусі, яго веры ва ўздым краіны і шчаслівую будучыню людзей.

Фота Кастуся Дробава.

Паэзія Якуба Коласа — аб’ектыўнае адлюстраванне гістарычнай трагедыі беларускага народа, пазбаўленага нацыянальных, палітычных і грамадзянскіх свабод. Мара пра «вольную волечку», якая даражэйшая за ўсё на свеце, — скразны матыў творчасці паэта. Яго ідэал — заможнае і шчаслівае жыццё вольнага беларуса ў вольнай краіне.

Анталагізм і ўніверсальнасць

Для паэзіі Якуба Коласа характэрны анталагізм і ўніверсальнасць, інтэлектуальная заглыбленасць і філасафічнасць, што асабліва выявілася ў яго паэме «Сымон-музыка», над якой ён пачаў працаваць у 1911 г. Твор зазнаў тры аўтарскія рэдакцыі, якія красамоўна сведчаць пра складаныя ідэйна-эстэтычныя пошукі паэта, яго светапоглядную эвалюцыю. Аўтар меў на мэце адказаць на ключавыя пытанні — прызначэння мастацтва і ролі творцы ў грамадстве.

У паэтычным шэдэўры «Сымон-музыка» аўтар уздымае фундаментальныя праблемы жыцця і смерці, асэнсоўвае ролю творчага чалавека ў грамадстве, паказвае значэнне мастацтва ва ўдасканаленні прыроды людзей. Галоўны герой твора — Сымон — надзелены прыродай рэдкім музычным талентам, ён чуе галасы, унутраныя рытмы ўсяго жывога. Паэт адзначае няпросты лёс творчага чалавека, паказвае пакуты і выпрабаванні, якія ён церпіць на сваім шляху.

Амаль кожная значная сцэна паэмы мае сімволіка-алегарычнае значэнне, утрымлівае сацыяльна-філасофскі падтэкст, служыць мастацкім увасабленнем жыццёвай філасофіі паэта. Сцэна выгнання Сымона бацькам Панасам з хаты за малую правіннасць сімвалізуе стаўленне народа да сваіх талентаў, людзей адметных — музыкаў і творцаў. Жабрацкі стан народа, клопат пра першачарговыя патрэбы поруч з татальным невуцтвам, на думку паэта, не дазвалялі належным чынам узгадоўваць таленты, ацэньваць творцаў, людзей духоўнай і інтэлектуальнай працы.

Сімвалічны сэнс мае «Песня аб званох». Якуб Колас у іншасказальнай форме разважае пра сапраўднае мастацтва і пустазвонства. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы для талентаў, паэт верыць, што неўзабаве зноў загучыць голас праўдзівага звону, які будуць слухаць зоры і людзі, а ён будзе велічна клікаць да волі, праўды і згоды. У гімне вясне, якая традыцыйна выступае сімвалам абнаўлення жыцця, аптымізму і надзей на шчаслівую будучыню [illegible] выказаў неспатольную прагу са[illegible]х і палітычных змен, паляпшэн[illegible]чага клімату ў грамадстве. Аб [illegible] чаканнях выразна сведчаць [illegible]овы гімна: «Хай твая краса [illegible] абудзіць родны край».

Сцэны захопленай, самаадданай ігры Сымона на скрыпцы, пранікнёны голас якой закранаў усё жывое наўкола, сімвалізуюць веліч мастацтва, яго незвычайнае ўздзеянне на чалавека праз пачуцці, здольнасць «гаіць раны».

Мастацкі шэдэўр нацыянальнай літаратуры — паэма «Новая зямля». Твор — сапраўдная мастацкая энцыклапедыя жыцця беларускага народа. Паэт апявае працу селяніна-земляроба, узвышае яго, паказвае высокую мараль і жыццёвыя прынцыпы беларусаў, іх шчырае дбанне пра сваю зямлю і лёс нашчадкаў.

Стварыў Якуб Колас і выдатныя ўзоры пейзажнай лірыкі. Верш «Нёман» — гімн велічнай рацэ, яе чароўнай прыгажосці і чысціні. «Дуб» — напісаны ў рэчышчы фальклорных традыцый. Услаўляецца ў ім дрэва-волат, якое сімвалізуе прыгажосць прыроды, выклікае незвычайныя эмоцыі. Значную мастацка-эстэтычную вартасць маюць паэтычныя творы: «Майская раніца», «Увосень», «Вецер», «Вераб’іная ноч», «Вячэрнія хмаркі», «Вясна», «Неба». У іх яркія малюнкі чароўнай прыроды роднага краю.

Паэтычным творам Якуба Коласа ўласціва сацыяльная крэатыўнасць, што найбольш выразна выявілася ў яго паэмах «Суд у лесе» (1943), «Адплата» (1944), «Рыбакова хата» (1947).

Празаічная спадчына класіка

Першая яго празаічная праца «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» пабачыла свет у 1909 г. У зборніку пераважалі мастацкія замалёўкі прыроды — вясны і лета, восені і асенніх ясных дзён, зімы і зімніх халадоў, мяцеліцы, навальніцы, дуба-асілка, ручая, летняга поўдня, разліву Нёмана, летняй раніцы ў вёсцы, летняй ночы, сушы, лясного пажару, заходу сонца, адлёту птушак.

Пазней Колас напісаў цыкл апавяданняў, навел і аповесцей. Высокім мастацкім узроўнем адрозніваюцца многія яго творы малой прозы: «Соцкі падвёў», «Бунт», «Нёманаў дар», «Малады дубок», «Стары канакрад», «Крывы вір», «Пракурор», «Адукацыя», «Туды на Нёман», «У двары пана Тарбецкага», «Хатка над балоткам», «На святой зямлі». У іх створаны яркія вобразы, рэалістычна паказаны разнастайныя аспекты сацыяльнага і грамадскага жыцця.

Найвышэйшым мастацкім дасягненнем Якуба Коласа на ніве прозы з’яўляюцца «Казкі жыцця» (1907—1921). Яны ўключаюць 33 сімволіка-алегарычныя навелы, у якіх пісьменнік закранае ключавыя сацыяльна-філасофскія і маральна-этычныя праблемы.

Навела «У балоце» паказвае тупік, «балота», куды завёў грамадства эгаістычны пануючы клас. Праз мастацкія сродкі аўтар дэманструе няздольнасць паноў рухацца ўперад, іх адмаўленне ад сацыяльнага дыялогу і ўзаемадзеяння.

Сацыяльны і нацыянальны аптымізм, вера ў перамогу здаровых народных сіл гучаць у навеле «Жывая Вада». У «Адзінокім дрэве» Якуб Колас сфармуляваў філасофію выжывання адметнага індывідуума ў віхуры падзей на пранізлівых вятрах гісторыі. На думку пісьменніка, найбольш надзейны сродак выжывання — мацней трымацца за родную глебу, абапірацца на свой народ, ці як кажа ён у вобразнай форме: «Пусціць глыбей карэнні ў зямлю».

Найважнейшы празаічны твор Якуба Коласа — трылогія «На ростанях» (1921 — 1954), у якой пісьменнік аб’ектыўна паказаў лёс беларускага народа ў першай палове XX ст. Праз вобраз галоўнага героя — настаўніка Андрэя Лабановіча — раскрыты напружаныя інтэлектуальныя і духоўныя пошукі нацыянальнай інтэлігенцыі.

Пісьменнік прасочвае, як Лабановіч паступова прыходзіць да ўсведамлення чароўнай велічы і прыгажосці роднага краю. Ён пераадольвае шаблонныя ўяўленні пра Беларусь як занядбаную старонку, яго сэрца напаўняецца гонарам за Бацькаўшчыну. Урэшце, у яго душы выспявае пратэст супраць знявагі і прыгнёту беларускага народа. Герой прыходзіць да выразнага ўсведамлення неабходнасці штодзённай і самаадданай працы на карысць нацыі.

Трылогія «На ростанях» насычана шматлікімі філасофскімі адступленнямі, глыбокімі разважаннямі пра сутнасць жыцця і загадкавасць прыроды. Ключавыя філасофскія ідэі пісьменнік выказвае вуснамі станоўчага персанажа твора — Андрэя Лабановіча, які абараняе сацыяльную і чалавечую годнасць простага працаўніка, селяніна, «мужыка». На яго думку, асноватворным чыннікам сацыяльных пераўтварэнняў грамадства з’яўляюцца адукацыя і асвета.

На старонках твора ўздымаюцца ключавыя сацыяльныя і грамадскія праблемы, асэнсоўвае надзвычай шырокі жыццёвы матэрыял. Беларускі геній адным з першым у нацыянальнай і еўрапейскай літаратурах загаварыў пра першачарговую неабходнасць захавання экасістэмы, створаных прыродай цудадзейных асяродкаў, спрыяльных для паўнавартаснага жыцця людзей.

* * *

Якуб Колас — заснавальнік беларускай інтэлектуальнай паэзіі і прозы, у якой арганічна спалучаліся рэалістычная і сімвалічная плыні, сацыяльная скіраванасць і філасофская заглыбленасць. Ён аналізуе складаныя адносіны паміж чалавекам і прыродай, выяўляе глыбінныя, архетыповыя пласты народнай этыкі і маралі.

У творах песняра вельмі шмат уласна мастацкіх адкрыццяў. Яго паэтычныя і празаічныя шэдэўры ўтрымліваюць безліч яркіх вобразаў і полісемантычных сімвалаў. Вызначальная рыса эстэтыкі класіка нацыянальнай літаратуры — аптымістычны погляд на чалавека і грамадства, вера ў светлую будучыню роднага краю.

Іван САВЕРЧАНКА,
дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі,
доктар філалагічных навук, прафесар

Ваўчаня шукае сяброў

Хто з дарослых не напяваў дзеткам у маленстве калыханкі, каб яны перад сном былі паслухмянымі і хутчэй засыналі. Ці не самая папулярная «Баю, баіньку, баю»:

Баю, баіньку, баю,
Не лажыся на краю.
Не лажыся на краёк,
Прыйдзе шэранькі ваўчок,
Цябе схопіць за бачок.

Немаўля старалася хутчэй размясціцца пасярод ложачка. Ды вочкі заплюшчыць. Каб чаго добрага не з’явіўся гэты «шэранькі ваўчок». А крыху падросшы, некаторыя хлопчыкі ці дзяўчынкі ўжо шкадавалі яго. Калі цябе ўсе баяцца, так кепска. Ні з кім не пагаворыш, ні з кім не пасябруеш. А без сябра — адзінока.

Што гэта сапраўды так, відаць ужо з самага пачатку кнігі Дзмітрыя Мікалаева «Прыгоды цікаўнага ваўчаняці», выпушчанай выдавецтвам «Беларусь»: «Цяжка быць ваўком. Нягледзячы на тое, што ты яшчэ маленькі, добры і жывеш у вялікім казачным лесе ў адной выдатнай краіне... Ты — будучы воўк, а значыць, павінен быць злым, таму і баяцца ўсе з табой сябраваць. А быць аднаму — гэта так дрэнна…» Да каго не падыдзеш, кожны ўцякае. Убачыла гэтае ваўчаня, што ў зайчаняці і вавёрачкі не ўсё атрымліваецца ў гульні з мячом, захацела паказаць, як біць па ім, а яны закрычалі ў страху: «Воўк» — і ходу. Паскардзілася яно матулі, а яна і кажа: «Разумееш, многае ў жыцці залежыць толькі ад цябе самога. Ад тваіх учынкаў, тваіх думак. Твайго сэрца. Галоўнае — заставайся самім сабой, і ў цябе абавязкова з’явяцца сябры. Я ў гэтым упэўнена. Бо ў цябе добрае сэрца. А што можа быць лепш?»

Задумалася ваўчаня… Здавалася б, усё прасцей простага. Ты да іншых са спагадай — і яны гэтаксама да цябе. Але ў сапраўднасці аказалася інакш. Узялося яно аднесці матылька дамоў, а той спалохаўся. Ці яшчэ выпадак. Баючыся, што рыбкі патонуць, скокнула ваўчаня ў возера. Добра, што яго крыкі аб дапамозе пачуў мядзведзь, а то пайшло б на дно. Прыйшоўшы ў сябе, роспачна паскардзілася мядзведзю: «Зноў дапамог не тым, каму трэба... І што цяпер? Нікому не дапамагаць?» А мядзведзь, як раней і матуля, даў яму яшчэ адзін добры ўрок.

Парады і ваўчыхі-матулі, і мядзведзя дыдактычнага характару. Аднак гэта не на шкоду мастацкасці і, што важна для дзяцей, займальнасці. Навідавоку важная стрыжнявая выхаваўчая аснова. Тое, што адбываецца ў творы далей, пераконвае юных чытачоў у тым, якімі трэба быць, што рабіць, каб цябе не проста заўважалі, але і ставіліся да цябе як да роўнага.

Звераняты разам будуюць школу, а дзе талака — там і сяброўства. Яны не толькі лепш пазнаюць адно аднаго, а пашыраюць кругагляд. Напрыклад, ваўчаня даведваецца, што вызначыць час можна па сонечным гадзінніку. Неаднойчы пераконваюцца малыя насельнікі лесу, як гэта добра, калі адзін за ўсіх, а ўсе — за аднаго: «Сябар маіх сяброў — мой сябар». А колькі радасці галоўнаму герою твора прынесла знаёмства з сабачкам! Упэўніўся, наколькі яны падобныя, але ў той жа час і розныя..

Пачынаецца кніжка, як ужо гаварылася, з усведамлення ваўчаняці, што «быць аднаму — гэта дрэнна», а завяршаецца тым, што яно знайшло сапраўдных сяброў і ад гэтага адчувае сябе шчаслівым. А каб шчаслівым быў і яго новы сябар, праводзіць сабачаня ў вёску.

«Прыгоды цікаўнага ваўчаняці» — цудоўны падарунак хлопчыкам і дзяўчынкам не толькі ад аўтара кнігі Дзмітрыя Мікалаева, але і ад мастачкі Карыны Волкавай. Яе малюнкі, што займаюць больш чым трэць аб’ёму — таксама непаўторны свет маленькіх братоў нашых меншых. Але ж дзеці ёсць дзеці. У тых зверанятах, пра якіх апавядаецца, хлопчыкі і дзяўчынкі ў нечым пазнаюць і сябе. Свет маленства цікавы і захапляльны. Безумоўна, калі добра ўсё складваецца.

Ганна ІВАНЕЙ

У вандроўк… ў свет Вы…

КРЫТЫКА СЕРАДА

Калі я чую … на думку адразу ж п… …тышкевіч. На працягу н… …рных часопісах выходзі… …таксама грунтоўны раман … …ось нарэшце чатыры аповесці з… …ліся ў кнізе «Вершнікі на дарозе». Уд… …менавіта гэтая кніга адкрывае цэлую сер… …энтэзі».

Перш… …спавесці пра змест зборніка, варта адзначыць стыльнае афар…енне кнігі. Мастачка Ірына Андрэева ўклала шмат высілкаў і таленту, каб кніга выглядала неверагодна прыгожа. Шыкоўная вокладка і ілюстрацыі да кожнай аповесці не могуць не прывабіць, ну і, пагадзіцеся, прыгожую кнігу хочацца чытаць! І магу запэўніць, што прачытаць «Вершнікаў на дарозе», безумоўна, варта.

Па-першае, гэта вельмі якасная літаратура. Маргарыта выдатна валодае словам, яе адметны аўтарскі стыль немагчыма пераблытаць з чыімсьці іншым. А чытаць кнігу на чыстай беларускай мове, без нагрувашчвання запазычанняў, чым нярэдка грашаць сучасныя аўтары, — адна асалода.

Па-другое, фэнтэзійны вугеркаўскі цыкл не з’яўляецца чымсьці далёкім ці чужым. Выдатнае веданне беларускай міфалогіі і фальклору дазволіла аўтарцы стварыць свет, які ўспрымаецца як цалкам свой, родны. Вядомая рэч, у аповесцях можна адшукаць алюзіі і на кельцкую, і на скандынаўскую міфалогію, але ўсе гэтыя моманты настолькі натуральна і па-майстэрску ўплецены ў агульны беларускі кантэкст, што абсалютна ніякага дысанансу не выклікаюць.

Ну і, па-трэцяе, чытаць «Вершнікаў на дарозе» проста цікава. Сюжэт кожнай з аповесцей дынамічны, таму засумаваць пасярод радка дакладна не атрымаецца, усе героі прапісаны максімальна дасканала, яны жывыя, за іх хочацца хвалявацца, ім суперажываеш. А гэта надзвычай важна, бо ў наш час цікавае і небанальнае фэнтэзі — рэдкасць. Напрыклад, самыя «разрэкламаваныя» фэнтэзійныя серыялы сучаснасці — «Дом цмока» і «Пярсцёнкі ўлады» — анічога, акрамя расчаравання не выклікаюць. І, па шчырасці, назіраць за тым, што ў іх адбываецца, можа надакучыць.

Адзначу, што зборнік Маргарыты Латышкевіч будзе цікавы як дзецям, так і дарослым. Бо тэмы, якія пісьменніца закранае ў аповесцях — пытанне выбару, пошук сябе, сяброўства і здрада, спрадвечная барацьба дабра і зла, — актуальныя ў любым узросце. І пры гэтым яны яшчэ і шчодра прыпраўлены захапляльнымі звышнатуральнасцямі і містыкай.

«Вершнікі на дарозе» — знакавая з’ява ў беларускай літаратуры. І я вельмі спадзяюся, што неўзабаве асобнай кнігай выйдзе і раман «Век людзей».

Яўген ПАПАКУЛЬ

Са стар… а хатняга чамаданчыка

КРЫТЫКА АЎТОРАК

Нядаўна выйшаў з друку зборнік прозы і паэзіі Алеся Ветаха «Л… рэта лета». Кніга арыгіна… дадзена і з паліграфі… гледжання: з адна… вана проза, а … Атрымаўс… ратур… крутка. … прозу — … дагары на… … паэзію. На… … — перавярнуў … …оў прозу.

Цікава яшчэ і тое, што Алесь Ветах, ён жа Алесь Бельскі, доктар філалагічных навук, прафесар, у бацькоўскім доме ў Цімкавічах на Капыльшчыне адшукаў свае нататнікі, сшыткі з абразкамі, замалёўкамі, мініяцюрамі, якія пісаў у маладосці. Таму меў рацыю Рыгор Барадулін, калі аднойчы напісаў усім нам вядомыя радкі:

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці…

Святое не страчвае і Алесь Ветах-Бельскі, які не забывае сваю Капыльшчыну, родныя Цімкавічы. Запісы і вершы з 1980—1990-х гадоў ляжалі ў невялікім чамаданчыку ў хатняй бібліятэцы бацькоўскага дома. Многія з гэтых твораў друкаваліся ў тагачаснай перыёдыцы. А цяпер аўтару асабліва захацелася перачытаць тое, што некалі ён рыхтаваў як творчыя заданні ўніверсітэцкіх выкладчыкаў Яўгена Камароўскага і Віктара Каратая, якіх ужо няма на гэтым свеце. У 1990-я гады выйшлі з друку кнігі прозы Алеся Ветаха «Ружовая знічка» (1994) і «Хроніка смутку» (1999), але не ўсё тады ўвайшло ў гэтыя выданні. І вось найлепшае адшуканае пабачыла свет асобнай кнігай.

Слова «лібрэта» мае некалькі значэнняў, яны ўсе падыходзяць да кнігі Алеся Ветаха. Бо тут ёсць і літаратурны тэкст, і пераказ зместу, і сюжэтны план... Такім чынам назва для яго кнігі ўдалая.

Не сказаць, што лета Алеся Ветаха адцвіло, адгудзела — яно працягваецца ў жыццёвай ціхай восені і светлай чыстай зіме. Але ў творчым плане паэт, празаік і даследчык нашай літаратуры толькі расцвёў, як чаромха з бэзам каля акна яго хаты ў Цімкавічах. Напісана дзясяткі падручнікаў, даведнікаў, кніг прозы і паэзіі, краязнаўчых даследаванняў. І праца па-ранейшаму працягваецца. Але ж існуе, як і ў кожнага чалавека, нейкая шчырая тужлівасць па маладосці. А ў творчага чалавека гэтая тужлівасць нашмат большая, бо часта дае ўяўленне пра творчыя пошукі аўтара ў пару яго духоўнага сталення.

Вершы, якія ўвайшлі ў «Лібрэта лета», былі напісаны 20-30 гадоў таму. Гэта нават не столькі вершы, колькі імгненні жыцця, летуценні пра каханне, радасць, сум і надзею. Арыгінальныя, яркія, вобразныя:

Далёка да сонца,
Да месяца, зораў.
Далёка да смутку,
Да гора і слёзаў.
І блізка да гаю,
Да вёскі і рання.
І блізка да вуснаў,
Вясны і кахання.

Сапраўды, усё проста, але шчыра і прыгожа. Радкі паэта, напісаныя ў той далёкі час, гучаць і сёння як абагульняльная формула, як паэтычнае выяўленне аптымізму маладосці. Вера паэта і сёння мае, такім чынам, сваю канкрэтную аснову. Яна ў сваім рамантычным пафасе застаецца нявыдуманай і жывой:

Завіс па-над ростаняй месяц,
Падбельвае бровы начы.
А двое пра рай летуценяць,
Зліліся, нібы спарышы…

З другога боку кнігі Алеся Ветаха надрукаваны кароткія аповеды, абразкі і мініяцюры з нататнікаў і сшыткаў. З таго старога чамаданчыка. Сабраныя разам, гэтыя творы ствараюць пэўнае ўяўленне пра развіццё творчай індывідуальнасці пісьменніка на мяжы XX і XXI стагоддзяў.

Для афармлення вокладкі Алесь Ветах выкарыстаў рэпрадукцыю акварэлі Алеся Кваткоўскага «Уваход у грыбы». Гэта сімвалічна: як уваход у тое далёкае маленства і юнацтва, што насамрэч можа быць зусім блізкім.

Сяргей ЧЫГРЫН

«Тут усміхаюцца рамонкі…»

Клапоцячыся аб папаўненні плеяды таленавітых беларускіх паэтаў новымі імёнамі з ліку адоранай моладзі, Беларускі фонд міру сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь праводзіць Рэспубліканскі конкурс «Мір у душы — мір у краіне!» у рамках творчага праекта «Шчасце жыць у мірнай краіне».

Творчае спаборніцтва чарговы раз засведчыла істотны творчы патэнцыял беларускіх дзяцей, іх актыўную жыццёвую пазіцыю з уласцівымі каштоўнасцямі міру, патрыятызму, салідарнасці, гуманізму і талерантнасці, глыбіню мыслення і высокую маральную культуру ўдзельнікаў.

Дзіцячыя літаратурныя работы раскрываюць тыя каштоўнасці і асобасныя якасці, якімі павінен валодаць кожны грамадзянін краіны, які любіць яе і ўслаўляе ў сваіх добрых справах і міратворчай дзейнасці.

У конкурсе прынялі ўдзел навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і дадатковай адукацыі.

Прапануем чытачам штотыднёвіка невялічкую частку паэтычных работ, што прайшлі рэгіянальныя адборы, былі адзначаны журы і ўвайшлі ў зборнік «Краіна міру».

Варвара АНДРЫЯШКА

8 гадоў, Гошчаўская сярэдняя школа Івацэвіцкага раёна

Любімая старонка

Я жыву ў цудоўнай краіне,
У краіне азёр і бяроз...
Лёгкі ветрык вясною абдыме
Жыта ў полі, пшаніцу, авёс...

Я жыву ў краіне ўтульнай,
І спакойна мне тут удвая,
Бо жывуць тут любімыя людзі —
Беларуская наша сям'я.

А якая вясна, падзівіся,
У любімай старонцы маёй!
Нездарма ў буслянку вярнуўся
Белы бусел да родных краёў.

І на сэрцы заўсёды так лёгка,
Калі бачыш між лісця бяроз,
Як узнімаюцца жаўранкі звонка
З песняй гучнай да самых нябёс.

Даніла ДАРАНУЦА

12 гадоў, Глінская дзіцячы сад — сярэдняя школа Докшыцкага раёна

Мой край

Мілы край, той, дзе я нарадзіўся,
Дзе шумяць векавыя бары,
Дзе Бярэзіна з Поняй сышліся,
Дзе спявае жаўрук на зары.

Мілы дом, дзе матуля пяшчотна
Мне ўсмешкамі дорыць цяпло.
Там навекі забудзеш турботы,
Атрымаеш любоў і святло.

Мой народ — такі шчыры і добры!
Тут суседу сусед — нібы брат.
На жытнёвых бяскрайніх прасторах
Беларуса сустрэць кожны рад.

Мая вёска — маё захапленне,
Не знайсці больш у свеце такой!
Ручая гаварлівы струменьчык
Тут злучыўся з імклівай ракой.

Людзі, вобразы, казкі і песні
Славяць гэту святую зямлю.
Усё тое, што дорага сэрцу,
Я шаную і шчыра люблю!

Валерыя ТРУХАНОВІЧ

12 гадоў, сярэдняя школа № 1 г. Петрыкава

Гімн шчасцю

Пашчасціла мне нарадзіцца
У самай казачнай краіне,
Дзе ў Прыпяць сонейка глядзіцца,
Палошча свае косы ў плыні.

Стаяць бярозанькі-фарсухі,
Нявесцяцца ў сукенках белых.
Спяваюць птушкі-шчабятухі —
Гімн шчасцю чую ў гэтых спевах.

А не крануты луг касою
Дзяўчатам дорыць царства кветак,
Дзівоснаю вакол красою
Малюе жывапісец-лета.

Тут усміхаюцца рамонкі
І васількі глядзяць пяшчотна.
Схілілі да зямлі галоўкі
Званочкі мілыя самотна.

Прымчыць на лёгкіх крылах вецер,
Дыхне прыемнай прахалодай —
Аркестр дзівосны самы ў свеце
Напоўніць сэрца асалодай.

Пражу нямнога я ў Бога:
Хай Усявышні дасць вясну,
Каб стужкі вечныя — дарогі
Былі без пораху-пяску!
Хай будзе мір на ўсёй планеце!
Хай будзе шчасце без пакут!
Смяюцца, радуюцца дзеці!
Ім будзе лепшым родны кут!
Хай птушкі мірна
кружаць у небе,
Будуюць гнёзды, як заўжды!
Не шлі народам, Божа, гневу
І захіні ўсіх ад бяды!
Малюся ў цішыні да Бога
І думкамі да неба мкну,
Каб мы ля роднага парога
Чакалі любую вясну.

Фота Кастуся Дробава.

А каля белай канюшыны
Нястомныя закружаць пчолы,
Як мой народ — руплівы, мірны.
Яго душа — скарб незлічоны!

Мінулі ў сівізне далёкай
Гісторыі крывавай знічкі.
Буслоў кранае дружны клёкат
І вечны спеў старой званічкі.

З табою плачу і святкую,
Табой, Айчына, ганаруся!
За чысціню тваю святую
Названа светла Белай Руссю!

Соф'я МІКУЦЭВІЧ

12 гадоў, сярэдняя школа № 2 г. п. Рось Ваўкавыскага раёна

Малітва

Малюся ў цішыні да Бога
І думкамі да неба мкну:
Бяды ў свеце сёння многа,
Няшчасцяў, крыўды — не да сну.

Ксенія ВЕРАМ'ЁВА

12 гадоў, Міхееўская сярэдняя школа Дрыбінскага раёна

Як добра сонечным ранкам...

Як добра сонечным ранкам
Прайсці басаногі па траве,
Пачуць над бацькоўскім ганкам
Жаўруковыя гімны вясне.
Як добра ўдыхаць водар кветак,
Што ў матчыным садзе растуць,
І чуць за акном гоман дзетак,
Што раніцай
у школу ідуць.
Як добра ў чыстым небе
Праменьчыкі сонца лічыць
І слухаць, як недзе ў лесе
Чароўнае рэха гучыць,
І бачыць, як бусел над дахам
Буслянку майструе вясной
І як за гасцінным шляхам
Жыты ўзняліся сцяной.

Як дрэнна, калі над табою
Чорныя хмары плывуць,
Калі ад гарматнага дыму
Кветкі зусім не цвітуць.
Як дрэнна, калі ад снарадаў
Уночы дзіцятка крычыць,
Калі ад яго роднай хаты
Пажарышча толькі дымяць.
Як горка вакол сябе бачыць
Замест васількоў на мяжы,
Як вечным папрокам усходзяць
На ўзгорку-пагосце крыжы.
Давайце забудзем пра спрэчкі!
Давайце ўсім даравацъ!
Давайце не помніць ліхое,
А будзем усе сябраваць!

Кацярына ЛІМОНАВА

15 гадоў, дапаможная школа-інтэрнат № 10 г. Мінска

Цаніце мір!

Як добра раніцай светлай, іскрыстай
Прабегчы па лузе халодным, расістым!
Узняць свае рукі да сонца, да неба,
Баяцца пажараў і стрэлаў не трэба.
Не трэба ўцякаць табе з роднае хаты,
Бо недзе паблізу страляюць гарматы,
Страчаць кулямёты і рвуцца снарады,
Гарыць усё навокал і гінуць салдаты.
Не трэба нам слухаць,
як дзеці галосяць,
Як хлеба, галодныя, жаласна просяць,
Як маці, прыкрыўшы сабою малога,
Крычыць у адчаі: «Трывога! Трывога!»
А можна спакойна, без страху,
прачнуцца,
Зямлі сваёй роднай і маме ўсміхнуцца.
Сказаць на ўвесь голас:
«Дзень добры, вітаю!»
Жыву я шчаслива і гора не знаю.
Я знаю, якою цаною ўсё гэта далося,
Каб людзям у міры і ў шчасці жылося,
Каб сонца не згасла,
не плакалі дзеці,
Каб толькі ўсмешкі гулялі па свеце.
Зямны свой паклон я аддам ветэранам,
Якіх ужо мала — памерлі ад ранаў.
Тым, хто ў пекле вайны тае
страшнае згінуў,
Каб мелі мы шчасце —
жыць у мірнай краіне,
Каб ціш і спакой нас усіх акружалі,
Каб жыта сярпамі на полі мы жалі,
Каб кветкі ў лузе, цяпло з вышыні...
Цані гэта, дружа, навекі цані!

Ганна ГАРБАЧОВА

15 гадоў, Ігрушкаўская сярэдняя школа Крупскага раёна

Мой белы бусел

Як белы ветразь у блакіце неба
Лунае бусел над маёй радзімай,
Як сімвал міру, годнасці і веры
Над светам расхінае свае крылы.

Мой сябар задуменны — белы бусел —
Плыве ў чыстым небе над ракою
І над прыгожай светлай Белай Руссю
Шчаслівай майскай сонечнай парою.

Прайшло з тае пары гадоў нямала,
Калі вайна ішла па родных вёсках,
Калі рукой крываваю знішчала,
Ламала і крышыла нашы лёсы.

Калі Хатынь танула ў чорным дыме —
Ад страху гоні родныя дрыжалі...
Прайшло нямала год, а сэрца стыне
Ад жаху непрытворнага і жалю.

І зараз на зямлі маёй буслінай
Жывая памяць — нібы напамінак:
Такое паўтарыцца не павінна,
Няхай вайна навек і раптам згіне!

Няхай народ мой беларускі будзе
Гасцінным, працавітым і шчаслівым!
Няхай жывуць пад мірным небам людзі
І бусел расхінае свае крылы!

Спяваць і плакаць душой

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Матуля

Мая незабыўная, клапатлівая, цярплівая матуля! Марыя Еўдакімаўна Пазнякова (у дзявоцтве — Зыкава). Колькі ёй давялося перажыць, вынесці, сцярпець! І цяжкой працы з самага маленства, і жахаў ваеннага ліхалецця. А ці проста гэта — нарадзіць і выгадаваць васьмярых дзяцей?! А ці лёгка было на трэці дзень пасля родаў ісці ў поле жаць збажыну? І — якая мужнасць — уберагчы ў полымі вайны сябе і двух малалетніх сыноў! Першы муж загінуў на фронце. Пасля вайны выйшла замуж за ўдаўца, на руках у якога вайна пакінула траіх дзетак. А затым далі жыццё і нам шасцярым, сярод якіх я — чацвёрты.

Прала і ткала, шыла і вязала, кухарыла і глядзела гаспадарку, паспявала на агародзе і ў саўгасе. Якое дзіва было назіраць, як яна чаравала за кроснамі, з глыбіні вякоў дорачы нам прыгожыя нацыянальныя ўзоры, святло працавітых рук і сэрцаў далёкіх продкаў, якія прыдумалі, захавалі шыкоўнае ўмельства.

Ды як балюча было мне ў час адпачынку прачынацца ўночы ад матулінага стогну. Гэтак балелі ёй спрацаваныя рукі і натруджаныя ногі… А як жа добра, утульна, цёпла і святліста было, калі мама, родная, ціхмяна-мудрая, клапатліва-ласкавая, была побач! Як зачароўвала яна незвычайнымі паданнямі, жыццёвымі прыгодамі, яскравымі ўспамінамі…

Скончыўшы школу, мы ўсе раз'ехаліся па гарадах, наведваючы бацькоў усё радзей і радзей. Апошнія гады свайго жыцця матуля жыла адна, пільнавалася сваёй хаты, не хацела і не магла жыць у горадзе… Сягоння, калі ўжо даўно яе няма, дакараю сябе, што не знаходзіў часу часцей праведаць самага дарагога чалавека, цалаваць яе спрацаваныя і пяшчотныя рукі, радавацца яе родным васільковым вачам, казаць ёй цёплыя, удзячныя словы…

Мама заўсёды здзіўляла мяне сваёй інтэлігентнасцю, хаця і не вучылася ў школе, не чытала кнігі (найстарэйшая ў сям'і, вымушана была дапамагаць бацькам гадаваць малодшых сясцёр і братоў). Ніколі не навязвала сваіх поглядаў і меркаванняў, але магла заўсёды даць слушную параду, выслухаць сэрцам і дапамагчы ў самыя складаныя моманты жыцця. Вызначалася глыбокай, мяккай і шчырай дабрынёй, цеплынёй шчодрай і шчырай душы.

Матчына надзея

Матчына сэрца! Колькі цеплыні, святла і чысціні нараджаецца, віруе ў ім! Матчына любоў! Што можа быць глыбейшае за яе?! Хіба толькі любоў да Радзімы, да роднага краю. Але ж і Радзіма пачынаецца з маці! Матчына вера, матчына надзея! Яны бясконцыя, як само жыццё.

Чым далей, тым больш і вастрэй адчуваю іх жыццядайнасць, усёмагутнасць, іх веліч. І не толькі таму, што з кожным годам усё далей і далей маё апошняе развітанне з матуляй — шчырай і клапатлівай, як пчолка, добрай, уважлівай і чулай, як ніхто. Не толькі таму, што ўсё часцей кліча да сябе невялікая вёсачка Заброддзе на Быхаўшчыне, амаль бязлюдная, але па-ранейшаму атуленая садамі, бэзам, клёнамі і ліпамі. Забытая і сумная, у якой блукае маё хутканогае залатое дзяцінства...

На ўсё жыццё ўзрушаны я сілай матчынай любові, веры і надзеі. Да апошніх дзён у душы будзе заставацца вобраз маёй бабулі Матруны Зыкавай. Нарадзіла адзінаццаць, выхавала сямёра дзяцей. Вайна адабрала яшчэ двух сыноў. Васілька, партызанскага разведчыка, пахавала сама, рызыкуючы жыццём. Ды, відаць, не проста рызыка гэта была — пад носам у фашыстаў тайна пахаваць сына-партызана. Гэта праява мужнасці. На Пецьку, «самага меншанькага», атрымала пахавальную. Ды не паверыла ёй Маці. Трыццаць два гады чакала сына. У кожны выхадны дзень, у кожнае свята спачатку жвава, а як пастарэла, то з кійком, паволі спяшалася сустракаць свайго Пецьку. Усе трыццаць два гады прыслухоўвалася да гудзення машын, да начных шумаў, чакала: можа, Пецька прыехаў? Можа, сын стукае ў шыбу? — і цвёрда верыла: ён прыедзе! А разам з ёю, ужо як пачаў разумець і думаць, чакаў дзядзьку Пецю і я. Калі ж дарослыя казалі, што ён ніколі ўжо, мабыць, не вернецца, я моўчкі прымаў гэта за абразу, плакаў, забіваўся ў куток, і пачынаў верыць яшчэ больш. Крыўды як не было. Хіба мог я трымаць яе ў душы, калі побач была бабуля, якая і за 85 гадоў не развучылася заставацца ласкавай, не страціла душэўнай гаючасці і чысціні.

Паміраючы, бабуля пытала: «Хто гэта прыйшоў? Гэта не Пеця? — і прасіла: ён аб'явіцца яшчэ, чакайце...»

І я чакаў... І кожны незнаёмы ветэран вайны для мяне як дзядзька Пеця.

Боль

Працуючы лютай зімой у сталічнай утульнай кватэры, часта са шчымлівым болем згадваю шчырую, мудрую матулю — у халаднаватай вясковай хаце, той дзе яна жыла ў апошнія гады. Прасторную матчыну хаціну не проста было ацяпліць у вялікі мароз. Патрабавалася часцей паліць у грубцы. Уяўляю, як яна цяжка тупала, несучы з дрывотні бярэмца дроў, потым — другое, трэцяе... А я гэтак рэдка вырываўся з абцугоў службовых, творчых і сямейных спраў і праблем. Дарога ж няблізкая — 250 кіламетраў.

Што тыя чатыры-пяць прыездаў у год?! Хоць штораз нарыхтоўваў матулі ў запас пабольш сухіх дроў, а таксама смалістай лучыны, якую складваў у хаце ў запечку... А патрэбна было ўсё ж часцей і больш бываць у матулі, якая нібы прырасла да роднага кутка, не жадаючы і блізка мяняць яго на ўтульную гарадскую кватэру некага са сваіх дзяцей. Няхай і разумела і даравала маю занятасць, аднак я ўсё часцей уяўляю яе адну ў зімовую сцюжу, у халаднаватай хаце... І вочы мае вільгатнеюць…

Сяброўка

Аднаго разу я сустрэў яе на гарадской вуліцы. Выйшаў з тралейбуса, і літаральна на прыпынку яна заўважыла мяне. Маё з'яўленне для яе было настолькі нечаканым і адначасова радасным, што яна стрымгалоў кінулася насустрач. Гучна выяўляючы сваё невымоўнае захапленне і пяшчоту, пачала скакаць вакол мяне, абдымаць і нават цалаваць у шчокі, нос, лоб, імкнучыся цмокнуць у губы. Я таксама быў вельмі рады гэтай сустрэчы і яе шчырай, моцнай любові да мяне. Шматлікія мінакі, прыемна ўражаныя незвычайна дзівосным відовішчам, з прыязнымі ўсмешкамі пазіралі на нас. Некаторыя спыніліся і асобныя з іх нават уголас выказвалі сваю непадробную захопленасць нашай вельмі цёплай сустрэчай. Спыніўся і тралейбус, затармазілі і легкавыя аўтамабілі. Пасажыры і вадзіцелі сонечна ўсміхаліся, нібы кожнага з іх напаткала чароўнае пачуццё замілаванасці незвычайнай прыгажосцю, зайздросным шчасцем. Не ведаю, аб чым думаў кожны з іх, як успрымаў нашу з мілай сяброўкай адданасць адно аднаму, але на многіх тварах я заўважаў і здзіўленне, і захапленне, і глыбокую ўзрушанасць. Нібы яны сталі сведкамі доўгачаканай, шчаслівай сустрэчы самых блізкіх і дарагіх істот, якіх звязвалі самыя высокія і светлыя пачуцці. І якіх, пэўна, разлучыла некалі нечуваная жыццёвая недарэчнасць.

А мы і сапраўды абое не маглі нарадавацца неспадзяванай сустрэчы, хоць і не бачыліся ўсяго з тыдзень. Я супакойваў і абдымаў маю слаўную сяброўку, ледзь ухіляючыся ад яе гарачых і гучных пацалункаў у губы. Яна ж не крыўдзілася ніколькі, не разумеючы, што пры людзях не надта добра цалавацца, тым больш у губы, і адкрыта паказваць усё сваё зачараванне, усю апантанасць. Сяброўка скакала вакол мяне, ускідваючы свае моцныя лапы на мае плечы. І ні мне, ні яе гаспадыні доўга не ўдавалася супыніць неверагодную сабачую радасць, вялікае сабачае шчасце. Нора, так звалі сабаку, з якой я раней, прыязджаючы на лецішча да сяброў, не адно лета падарожнічаў па грыбных лясах, паводзячы сябе з ёю як з самым надзейным і добрым сябрам, не супакойвалася. Ды і ў маёй душы жыло так многа незабыўных, мілотных момантаў, яркіх малюнкаў з нашых сумесных з ёю грыбных вандровак. І я адчуў сябе па-сапраўднаму шчаслівым. І вельмі адказным і абавязаным яе любові, веры і ўдзячнасці. Мы ў вялікай адказнасці за тых, каго прыручылі, хто паверыў нам, спазнаў нашу дабрыню і павагу, нашу любоў. І ўсім сэрцам адказаў узаемнасцю...

Шчасце

Якое гэта, аказваецца, невыказнае шчасце — павольна крочыць праз пяцьдзясят гадоў той жа палявой дарогай, што помніць цябе яшчэ зусім малечай і дзе ты басанож абмацаў у свой час кожны каменьчык, кожную ямінку... Ідзеш, разняволены, замілаваны роднымі краявідамі, і здаецца, што і жыта такое ж наўзбоч кланяецца табе важкімі каласкамі, як і паўстагоддзя таму, і васількі гэткімі ж сінявокімі зорачкамі прасвечваюць цябе сваёй пяшчотай. І піжма такімі ж сонечнымі гронкамі ўсміхаецца ветла, нібы добра знаёмаму. І нават палын гэткі ж гаркава-духмяністы і гаючы, як і тады. І на нейкі момант падаецца, што і я зараз — той жа віхрасты і цікаўны хлапчук, якому ўсё вакол такое любае, прыгожае, загадкавае, хвалюючае... Быццам на яве вярнуўся ў маленства. Нібы за плячыма не было ні выпрабаванняў, ні страт, ні болю... І ўсё ў цябе яшчэ наперадзе — таямнічае, неразгаданае, высокае, цудоўнае, вялікае...

Відаць, такое мажліва толькі на малой Радзіме, якую так глыбока ўвабраў у сэрца, і якая, выплыўшы з далёкага дзяцінства, злілася з сягоннішняй, такой жа мілай, чароўнай і чуйнай. У такія хвіліны спыняецца час, і адчуваеш сябе, як ніколі, часцінкай прыроды — вечнай і мудрай. І — самым шчаслівым у свеце. І хочацца крочыць і крочыць за далягляд, быць неверагодна добрым і шчырым, любіць бязмежна і бясконца, пісаць надзвычай узнёсла і прачула, спяваць і плакаць душой адначасова ад паўнаты найглыбейшых пачуццяў і найдзівоснейшых памкненняў.

Фота Кастуся Дробава.

Чытанні ў Купалавым доме

20 кастрычніка ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшлі XIV Міжнародныя Купалаўскія чытанні «Ад прадзедаў спадчына вякоўю», прысвечаныя 140-годдзю Янкі Купалы і 100-годдзю з... «Спадчына».

РЭПАРТАЖ ПАНЯДЗЕЛАК

Традыцыйная навуковая канферэнцыя, арганізаваная Купалаўскім... прысвечана творчасці і грамадскай дзейнасці Песняра, яго ... рускай нацыянальнай ідэнтычнасці, рэцэпцыі спадчыны...

Перад удзельнікамі і гасцямі выступіла дырэктар музея Ганна Галінская. Яна звярнула ўвагу на сі... валічнае супадзенне — на год, абвешчаны Годам гістарычнай памяці, прыпадае векавы юбілей зборніка «Спадчына»: «Што іншае, як не найкаштоўнейшая духоўная спадчына, — той багаты гістарычны вопыт, які пакінулі нам продкі. У нашай памяці, у нашай душы, у нашым сэрцы і сёння гучыць Купалава слова».

Вітальны зварот удзельнікам адрасавала галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова» Наталля Шапран: «Янка Купала — адзін з самых даследаваных творцаў беларускай літаратуры, а плён купалазнаўства мог бы скласці шматтомную бібліятэку. Аднак зварот да спадчыны класікаў ніколі не бывае марным. Упэўнена, што здабыткі сёлетніх чытанняў прыцягнуць увагу грамадскасці дасюль невядомымі фактамі ў жыццяпісе паэта, нечаканымі архіўнымі знаходкамі і нават смелымі адкрыццямі».

Купалаўскія чытанні атрымалі відэапрывітанне з Расіі ад Астраханскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай культуры, які ў верасні гэтага года зладзіў акцыю — анлайн-чытанні, прысвечаныя 140-годдзю Янкі Купалы. Вершы беларускага класіка чыталі юнакі і дзяўчаты — удзельнікі тэатральнай студыі «Эцюд» і маладзёжнага Этнаклуба Дома дружбы навукова-метадычнага цэнтра.

У канферэнцыі бралі ўдзел як вядомыя навукоўцы, так і даследчыкі, якія стаяць у пачатку шляху ў вялікую навуку. На пленарным пасяджэнні выступілі доктар філалагічных навук Валерый Максімовіч (Інстытут філасофіі НАН Беларусі) і доктар гістарычных навук Аляксандр Гужалоўскі (БДУ).

У дакладзе «Ідэя нацыянальнага згуртавання ў творчасці Янкі Купалы пачатку XX ст.» Валерый Максімовіч падкрэсліў: «Янка Купала з самага пачатку сваёй працы на ніве беларускага адраджэння ставіў сабе грандыёзную задачу, якая звязвалася з нацыянальным будаўніцтвам, з ліквідацыяй любых форм адчужанасці, варожасці, адасобленасці — усяго таго, што перашкаджала нацыянальнай кансалідацыі, працэсу набыцця нацыянальнай ідэнтычнасці». У дар музею ён перадаў сваю кнігу ... космас класікі». Сапраўдным падарункам прысутным стаў і яго ... е Купалу.

...оўскі ў паведамленні «Янка Купала і савецкая цэнзура» раскрыў ...остых адносін, якую сам Купала закрануў у вершы 1919 года ...клад пабудаваны на малавядомых дакументах з Нацыянальнага ...ы Беларусь.

... тэхналогіі дазволілі далучыцца да форуму калегам з Гродзенскага дзяр... ... ўніверсітэта імя Янкі Купалы, з якім сёлета музей заключыў дагавор аб супрацоўніцтве. Дырэктар універсітэцкай навуковай бібліятэкі Мікалай Грынько распавёў пра гісторыю і даследчыцкі плён ГрДУ як значнага цэнтра купалазнаўчых даследаванняў.

Фота Аркадзя Булы.

Наталля Якавенка (у цэнтры), галоўны захавальнік фондаў музея Надзея Саевіч (злева), вядучы навуковы супрацоўнік Валянціна Ціханавецкая (справа).

Тэматыка дакладаў ахапіла шырокае кола купалазнаўчай праблематыкі: ад літаратуразнаўчага аналізу да рэцэпцыі творчай спадчыны пісьменніка ў музейна-педагагічных праграмах. Вялікую цікавасць выклікалі паведамленні «Кіеўскі прыстанак рукапісу паэмы Янкі Купалы "Тарасова доля" (1939)» кандыдата філалагічных навук Мікалая Труса і «Таямніцы і знаходкі з Купалавага парку і ваколіц: ад папяльнічкі да скарбу залатых манет» вядучага навуковага супрацоўніка музея Янкі Купалы Паўла Каралёва. Яркую старонку гісторыі купалазнаўства ўзнавіла ў дакладзе «"Кніга высокага рамантычнага пафасу": зборнік Янкі Купалы "Спадчына" ў літаратуразнаўчай інтэрпрэтацыі В. І. Гапавай» знаная даследчыца Купалавай творчасці кандыдат філалагічных навук Ірына Багдановіч. З невядомымі ўспамінамі пра літаратурны вечар 5 красавіка 1939-га, у якім браў удзел Янка Купала, пазнаёміў загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі. Вядучы бібліятэкар бібліятэкі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат філалагічных навук Генадзь Кажамякін распавёў пра гісторыю трох выданняў кнігі аднаго верша Янкі Купалы «А хто там ідзе?» на мовах свету. Вопытам узнаўлення зніклых духоўных скарбаў падзяліўся ў дакладзе «Кнігазбор Янкі Купалы. Спроба рэканструкцыі праз 80 гадоў» супрацоўнік выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Сяргей Шапран.

Падчас канферэнцыі была прэзентавана кніга «Янка Купала» з серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» выдавецтва «Мастацкая літаратура». Выданне, падрыхтаванае да 140-годдзя народнага паэта Беларусі, прадставіла ўкладальніца, доктар філалагічных навук Наталля Якавенка. У кнізе, якая ўвабрала вопыт папярэдніх біяграфічных выданняў, прысвечаных Песняру, чытачу прапанавана багатая мазаіка з фрагментаў успамінаў, артыкулаў, лістоў, дакументаў і шматлікіх фотаздымкаў — каштоўных памятак Купалавага часу.

Галіна ВАРОНАВА,
вучоны сакратар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы

Памятаць пра загінулых, шанаваць жывых

Менавіта так павінны мы ставіцца да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў, да тых, хто праліваў сваю кроў у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Айчыны. Да ўсіх, хто на франтах і ў тыле набліжаў Вялікую Перамогу. На жаль, удзельнікаў той жудаснай вайны ў жывых застаецца ўсё менш, таму цяжэй становіцца захаваць дакладныя, праўдзівыя звесткі аб страшных і гераічных гадах, аб вялікім подзвігу нашага народа.

На сучасным этапе ўзмацняюцца спробы фальсіфікаваць гістарычную праўду, пасеяць у душах новых пакаленняў сумненні ў мужнасці і гераізме савецкіх людзей, у тым, што менавіта мы перамаглі самага страшнага ворага чалавецтва — фашызм. Таму вельмі важнай з'яўляецца пазіцыя беларускіх пісьменнікаў, якія з дапамогай мастацкага слова могуць і павінны адстойваць гістарычную праўду.

У сувязі з гэтым важнай падзеяй стала першая міжнародная канферэнцыя славянскіх літаратараў «Захаванне гістарычнай памяці сродкамі літаратуры і мастацтва — наш абавязак перад паўшымі, перад гісторыяй і наш абавязак перад сучаснымі і будучымі пакаленнямі», якая адбылася на Гомельшчыне. Ініцыятар і арганізатар гэтага мерапрыемства — заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы празаік, публіцыст і драматург Уладзімір Гаўрыловіч. Канферэнцыя праводзілася абласным аддзяленнем СПБ пры падтрымцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, абласной універсальнай бібліятэкі, абласнога аддзялення Беларускага фонду міру, многіх

пісьменніцкіх рэгіянальных арганізацый Расіі і Украіны.

З прывітальным словам выступілі намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Прывалаў, намеснік старшыні праўлення абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру» Уладзімір Восараў. З відэапрывітаннем да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуліся кіраўнікі творчых саюзаў Беларусі і Расіі, сустаршыні Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Мікалай Чаргінец і Мікалай Іваноў. Акрамя літаратараў трох краін, цікавыя, змястоўныя даклады і выступленні слухалі студэнты вышэйшых навучальных устаноў Гомеля і вобласці, работнікі культуры, адукацыі, вучоныя і спецыялісты розных сфер.

Асаблівую ўвагу прыцягнулі даклады Ганаровага старшыні СПБ, народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца («Мая памяць — галоўны абвінаваўца фашызма»), лаўрэата Дзяржаўнай і Нацыянальнай літаратурнай прэмій Рэспублікі Беларусь, празаіка і публіцыста Уладзіміра Саламахі («Сучасная беларуская літаратура працягвае выхоўваць патрыётаў»), старшыні Гомельскага абласнога аддзялення СПБ, заслужанага дзеяча культуры, празаіка, публіцыста і драматурга Уладзіміра Гаўрыловіча («Пра вайну і літаратуру»), сакратара праўлення, генеральнага дырэктара Саюза пісьменнікаў Расіі Васіля Дварцова («Не трэба забываць…»), сакратара Саюза пісьменнікаў Расіі, старшыні Краснадарскай краявой пісьменніцкай арганізацыі, заслужанага дзеяча мастацтваў Кубані, галоўнага рэдактара часопіса «Краснодар літаратурный», паэта, празаіка, публіцыста Святланы Макаравай-Грыцэнкі («Блажен, кто посетил сей мир в его минуты роковые»). Шмат слушных думак выказалі таксама член Саюза пісьменнікаў Расіі, паэт, празаік з Бранска Людміла Ашэка («Роля сучаснай літаратуры ў патрыятычным выхаванні моладзі»), паэт, старшыня Калужскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі Вадзім Цярохін («Слова можа кіраваць светам»), іншыя ўдзельнікі мерапрыемства з розных рэгіёнаў Беларусі, Расіі і Украіны.

У прынятай на канферэнцыі рэзалюцыі пісьменнікі абавязаліся рабіць усё магчымае, каб урокі Вялікай Айчыннай вайны, адлюстраваныя ў таленавітых і праўдзівых творах літаратуры і мастацтва, зноў станавіліся асновай генетычнай памяці нашых народаў і выказалі найглыбейшую павагу да ветэранаў-пераможцаў, дзяцей вайны і ўсіх, хто пацярпеў у ваеннае ліхалецце, вытрымаў страшэнныя пакуты. Удзельнікі канферэнцыі заклікалі сучасных славянскіх літаратараў пісаць новыя творы пра подзвіг народа-пераможцы, уносіць свой уклад ва ўмацаванне міру, братэрства і адзінства. У рэзалюцыі адзначана таксама: «Мы заклікаем усіх людзей добрай волі, сумлення і абавязку, асабліва падрастаючае пакаленне, праяўляць найглыбейшую павагу да нашай гістарычнай памяці. Мы заклікаем пісьменнікаў Беларусі, Расіі, Украіны і іншых брацкіх дзяржаў выступіць адзіным фронтам супраць фашызму, які ўзнімае галаву!»

Вельмі важна і тое, што ўсе матэрыялы канферэнцыі (а іх набралася на цэлую кнігу!) апублікаваны. Намаганнямі таго ж Уладзіміра Гаўрыловіча яны былі своечасова падрыхтаваны да друку і ўключаны ў чарговы выпуск міжнароднага трохмоўнага альманаха «Літара» (дарэчы, гэта літаратурна-мастацкі, культурна-асветніцкі праект старшыні Гомельскага аддзялення СПБ) — № 7 і 8 за 2022 год (здвоены выпуск). Кніга выйшла ў свет якраз напярэдадні важных падзей у культурным жыцці вобласці і краіны — XXVII Міжнароднага фестывалю-свята «Славянскія літаратурныя дажынкі», IV рэгіянальнага фестывалю літаратуры, культуры, мастацтва і народных традыцый «На зямлі Кірылы Тураўскага» з удзелам майстроў слова трох славянскіх краін, Дня беларускага пісьменства ў Добрушы.

Што яшчэ цікава: у кнізе змешчаны адказы літаратараў на пытанні спецыяльнай анкеты «Слова да памяці і міру», у якіх адлюстраваны думкі і меркаванні па ўсіх узнятых на канферэнцыі праблемах. Як бы працяг тэмы гістарычнай памяці і патрыятызму ў альманаху — паэтычныя і празаічныя творы амаль паўсотні расійскіх літаратараў і больш чым двух дзясяткаў пісьменнікаў Гомельшчыны. Кніга ў выдатным паліграфічным выкананні, у цвёрдай вокладцы выйшла тыражом 150 экзэмпляраў, паступае ў бібліятэкі, стане добрым памочнікам у патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення, паслужыць найважнейшай справе — захаванню нашай гістарычнай памяці.

Міхась СЛІВА

Юльян Сяргеевіч Пшыркоў... Гэтае імя ўвайшло ў гісторыю беларускай літаратуры ў сярэдзіне мінулага стагоддзя і заняло там не проста прыкметнае, а пачэсна знакавае месца. Яшчэ да вайны дэбютаваўшы некалькімі сціплымі крытыка-літаратуразнаўчымі публікацыямі, ён ужо да канца 1950-х гадоў вырас у найбуйнейшага вучонага-філолага, праніклівага і аўтарытэтнага даследчыка айчыннай літаратуры, чые навуковыя працы, апублікаваныя ў выглядзе манаграфій або артыкулаў, заўжды вызначаў[illegible] актуальнасцю і навізной, таму нязмен[illegible] запатрабаванымі не толькі ў асяро[illegible] спецыялістаў, але і шырокага [illegible] аматараў прыгожага пісьм[illegible]

Юльян Пшыркоў з жонкай, 1940 г.

ЛІТАРАТУРА ПАНЯДЗЕЛАК

Філал[illegible]ную навуку шануючы

Нарадзіўся Юльян Пшыркоў 31 кастрычніка 1912 г. у сяле Кісцяні цяперашняга Рагачоўскага раёна ў сялянскай сям'і. Кісцяні — вялікае сяло, якое маляўніча раскінулася на правым беразе Дняпра. Падчас маленства будучага вучонага ў сяле была толькі пачатковая школа, якую ён і закончыў у 1924 г. Вучобу працягнуў у Свержаньскай сямігодцы, дзе ў той час настаўнічаў Міхась Лынькоў, аднак школу праз год ліквідавалі, таму сямігадовую адукацыю завяршыў у Рагачове (1928).

Скончыўшы ў 1930 г. Рагачоўскія двухгадовыя педагагічныя курсы, працаваў настаўнікам у Звальніцкай, Буднеўскай пачатковых школах Клічаўскага раёна (1930—1932) і Царкоўскай сямігодцы Буда-Кашалёўскага раёна (1932—1934). У 1934 г. паступіў на філалагічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта, пасля заканчэння якога (1939) працаваў выкладчыкам Магілёўскага педінстытута. Вельмі хутка знайшоў агульную мову са студэнтамі, паразуменне з калегамі-выкладчыкамі. Але недзе праз год усё ў яго жыцці крута памянялася: спачатку ў лістападзе 1940 г. быў прызыў у Чырвоную Армію, а потым накрылі пякельныя віхуры Вялікай Айчыннай вайны.

Юльян Пшыркоў, 1974 г.

Удзельнічаў у баях пад Ленінградам і Кёнігсбергам, быў тройчы паранены. Прайшоў вайну, як кажуць, ад званка да званка. Выстаяў, выжыў, каб у доўгачаканым 1945-м адчуць усю паўнату шчасця салдата-пераможцы, які выраставаў свет ад карычневай чумы, адстаяў свабоду сваёй Айчыны. У дадатак да ўсяго гэтага адбыліся пазітыўныя перамены і ў асабістым жыцці: дзякуючы хадайніцтву Якуба Коласа яго дэмабілізавалі з войска і запрасілі на працу ў Інстытут літаратуры АН БССР. Чаму суджана было быць — тое і здзейснілася. Прынамсі, Якуб Колас ні разу не пашкадаваў, што працягнуў руку дапамогі здольнаму кісцянёўцу, а той, у сваю чаргу, ніколі не расчараваўся, што звязаў свой лёс з акадэмічнай навукай, абраўшы коласазнаўства сталым прыярытэтам уласнай даследчыцкай працы.

Захапленне творчасцю Якуба Коласа пачалося яшчэ ў школьныя гады. Падчас жа студэнцтва набыло пэўны прафесійны ўзровень. Прынамсі, сваю дыпломную работу, прысвечаную творчасці беларускага песняра, ён у выглядзе некалькіх артыкулаў надрукаваў у розных перыядычных выданнях. Сур'ёзную заяўку на рэпутацыю сталага і дасведчанага знаўцы гэтай тэмы ён прадэманстраваў у сваёй публічнай лекцыі «Народны паэт БССР Якуб Колас», прачытанай у 1949 г. у Мінску (выдадзена асобнай кнігай у тым жа годзе).

Выданні ж «Якуб Колас. Жыццё і творчасць» (1951) і «Якуб Колас. Критико-биографический очерк» (1952) гэтую рэпутацыю не толькі пацвердзілі, але і істотна замацавалі. Літаратурная грамадскасць вельмі прыхільна сустрэла выхад гэтых кніг, бо яны і сапраўды распачыналі новы этап у асэнсаванні творчасці класіка айчыннай літаратуры. Пагаджаўся з такімі ацэнкамі і сам Якуб Колас, які заявіў, што менавіта Ю. Пшыркоў быў першы, хто правільна ўспрыняў паэму «Новая зямля». Зрэшты, у згаданых працах, а таксама ў манаграфіі «Трылогія Якуба Коласа "На ростанях"» (1956) не толькі атрымалі правільную ацэнку канкрэтныя творы класіка, але і была прадэманстравана ў цэлым удалая спроба выйсці на якасна новы ўзровень асэнсавання многіх кардынальных праблем і з'яў гісторыі беларускай літаратуры. І выявілася гэта перш за ўсё ў паслядоўным адмаўленні догматаў вульгарнага сацыялагізму. Не, даследчык заўжды ўсведамляў непераходную значнасць сацыяльнага складніка ў выяўленчым полі літаратуры, але яшчэ са студэнцкіх часоў займеў перакананне, што творы мастацтва трэба ацэньваць па законах эстэтыкі. Менавіта недаацэнка эстэтычных крытэрыяў перашкаджала беларускаму літаратуразнаўству і крытыцы першага пасляваеннага дзесяцігоддзя ў поўнай меры выконваць сваю культуралагічную місію.

Павагу да іх Ю. Пшыркоў выказваў заўсёды, справядліва мяркуючы, што без яе нельга быць сапраўдным прафесіяналам. А на іх, гэтых сапраўдных, вельмі прыкметна ўзрос попыт у новай сацыяльна-палітычнай атмасферы, якая на пэўны час усталявалася ў краіне пасля гістарычнага XX з'езда КПСС. Роля Ю. Пшыркова ў пошуку і выхаванні новых кадраў для айчыннага літаратуразнаўства настолькі вялікая, што пра яе можна было б напісаць асобнае даследаванне. У 1954 г. ён узначаліў сектар дакастрычніцкай літаратуры і тэксталогіі Інстытута літаратуры АН БССР і працу па сумяшчальніцтве (яшчэ з 1945 г. працягваў выкладаць літаратуру ў Белдзяржуніверсітэце) не без поспехаў выкарыстоўваў дзеля пошукаў здольнай моладзі. Прыходзіла яна ў Інстытут літаратуры, як правіла, праз аспірантуру, але з самага пачатку для кожнага загадзя вызначаўся канкрэтны напрамак будучых даследаванняў, акрэслівалася так званая навуковая спецыялізацыя.

У сектары дакастрычніцкай літаратуры і тэксталогіі такіх напрамкаў і спецыялізацый было безліч, але яго загадчык выбраў некалькі прыярытэтаў: выяўленне новых твораў даўняй беларускай літаратуры, рэабілітацыя незаслужана забытых або забароненых імён, выданне твораў класікаў. Праўда, на практыцы атрымлівалася, што нікому з навукоўцаў не ўдавалася ўсёдзець на сваёй вузкай дзялянцы-спецыялізацыі, паколькі надта ж мала іх было ў параўнанні з агромністымі аб'ёмамі актуальных праблем, якія не цярпелі адкладу. Вось і Ю. Пшыркоў у знакавых выданнях сярэдзіны 1950-х гадоў «Очерк истории белорусской советской литературы» (Мінск, 1954) і «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры: дапаможнік для студэнтаў ВНУ» (1956) напісаў раздзелы не толькі пра «свайго» Якуба Коласа, але і наступныя: «Літаратура перыяду грамадзянскай вайны», «Літаратура перыяду аднаўлення народнай гаспадаркі і сацыялістычнай рэканструкцыі», «Міхась Лынькоў», «Максім Танк».

Значнай падзеяй у айчынным літаратуразнаўстве стаў выхад у 1960 г. манаграфіі Ю. Пшыркова «Беларуская савецкая проза (20-я — пачатак 30-х гадоў)». У сваіх рэцэнзіях, а іх было апублікавана звыш паўдзясятка, вучоныя розных рангаў і пакаленняў (С. Александровіч, А. Макарэвіч, А. Семяновіч, Я. Усікаў, І. Навуменка, А. Лойка, Л. Царанкоў) дружна прызнавалі яе высокі навуковы ўзровень, хвалілі аўтара за ўмелы падбор фактычнага матэрыялу і яго багацце, за наватарскія трактоўкі многіх праблем метадалагічнага плана, за аб'ектыўнасць ацэнак канкрэтных літаратурных фактаў, фактараў і асоб. За гэтае даследаванне ВАК СССР у 1962 г. прысудзіў Ю. Пшыркову ступень доктара філалагічных навук, а яшчэ праз два гады ён стаў і прафесарам.

Такі ж высокі навуковы ўзровень адзначалі спецыялісты і ў астатніх яго манаграфіях: «А. Е. Богданович» (1966), «Эпас рэвалюцыі: паэмы Я. Коласа "Новая зямля" і "Сымон-музыка", трылогія "На ростанях"» (1975), «Летапісец свайго народа: жыццёвы і творчы шлях Я. Коласа» (1982).

Вышэй ужо згадвалася, што навукова-даследчую працу яшчэ з даваенных часоў Ю. Пшыркоў гарманічна спалучаў з педагагічна-выкладчыцкай. Зразумела, што праблему падрыхтоўкі вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў для сістэмы адукацыі ён ведаў вельмі добра, як кажуць, знутры, таму заўсёды ахвотна ўдзельнічаў у праектах, скіраваных на вырашэнне гэтай праблемы. Так, у суаўтарстве з Н. Перкіным ён выдае ў 1959 г. кнігу «Беларуская савецкая літаратура: падручнік для 9—10 класаў сярэдняй школы», якая вытрымала 9 выданняў. Чатыры разы перавыдавалася кніга «Беларуская савецкая літаратура: дапаможнік для 10 класа сярэдняй школы» (1970—1971 гг., суаўтар — Н. Перкін). Вышэйшай жа школе фактычна адрасаваны ўсе публікацыі навукоўца: імі карысталіся дзеля вывучэння курса роднай літаратуры не толькі выкладчыкі ВНУ, але і найлепшыя студэнты.

Шчыры прыхільнік славянскага адзінства, Ю. Пшыркоў добра ведаў літаратуры ўсходніх славян, цікавіўся і іх гісторыяй, і сучасным станам. Пра гэта сведчаць многія яго публікацыі, у тым ліку «А. С. Пушкин и белорусская литература» (Известия АН БССР. 1949. № 3); «Пушкінскія традыцыі ў беларускай літаратуры» (ЛіМ. 1949. 21 мая); «Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура» (Беларусь. 1951. № 3); «Смотр искусства и литературы украинского народа» (Советская Белоруссия. 1951. 20 июня); «Вялікі сын украінскага народа» (Беларусь. 1956. № 8); «Новы часопіс "Радянське літературознавство"» (ЛіМ. 1957. 3 ліпеня) і інш.

Значны ўклад зрабіў Ю. Пшыркоў і ў станаўленне беларускай школы тэксталогіі. Пад яго кіраўніцтвам выйшлі першыя ў айчыннай эдыцыйнай практыцы навукова каментаваныя Зборы твораў Янкі Купалы ў шасці тамах (1952—1954), Якуба Коласа ў дванаццаці тамах (1961—1964), Максіма Багдановіча ў двух тамах (1969), Францішка Багушэвіча ў адным томе (1967). Тэарэтыка-практычныя набыткі гэтых выданняў дапамаглі ў працы па падрыхтоўцы больш поўных Збораў твораў — Янкі Купалы ў сямі тамах (1972—1976), Якуба Коласа ў чатырнаццаці тамах (1972—1978), Кузьмы Чорнага ў васьмі тамах (1972—1975), а таксама многіх іншых. У тым ліку і тых, якія выдаваліся пасля яго смерці.

Значнай падзеяй у айчынным літаратуразнаўстве стаў выхад у 1960 г. манаграфіі Ю. Пшыркова «Беларуская савецкая проза (20-я — пачатак 30-х гадоў)». У сваіх рэцэнзіях, а іх было апублікавана звыш паўдзясятка, вучоныя розных рангаў і пакаленняў (С. Александровіч, А. Макарэвіч, А. Семяновіч, Я. Усікаў, І. Навуменка, А. Лойка, Л. Царанкоў) дружна прызнавалі яе высокі навуковы ўзровень, хвалілі аўтара за ўмелы падбор фактычнага матэрыялу і яго багацце, за наватарскія трактоўкі многіх праблем метадалагічнага плана, за аб'ектыўнасць ацэнак канкрэтных літаратурных фактаў, фактараў і асоб. За гэтае даследаванне ВАК СССР у 1962 г. прысудзіў Ю. Пшыркову ступень доктара філалагічных навук, а яшчэ праз два гады ён стаў і прафесарам.

Памёр Юльян Сяргеевіч Пшыркоў 23 снежня 1980 года. Памёр раптоўна, непрадказальна. Такую смерць звычайна называюць лёгкай. Але што такое лёгкая смерць? Ды яшчэ калі ўлічыць, што чалавек пераступіў мяжу нябыту, абцяжараны многімі і многімі творчымі планамі і задумамі? Думаецца, не ў нябыт ён сышоў, а заняў сваё пачэснае месца ў пантэоне беларускай культуры ў яго літаратуразнаўчым сегменце — побач з Я. Карскім, А. Вазнясенскім, І. Замоціным, М. Піятуховічам і многімі іншымі знакамітымі навукоўцамі нядаўняга мінулага.

Сцяпан ЛАЎШУК,
доктар філалагічных навук,
член-карэспандэнт НАН Беларусі

Фота з сайта *nlb.by*

Чалавеку патрэбны чалавек

МАСТАЦТВА АЎТОРАК

У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў 20 кастрычніка адкрылася Другое трыенале маладых мастакоў. Фінальны этап Рэспубліканс... га конкурсу, які ладзіцца Міністэрствам к... ры Рэспублікі Беларусь, скіраваны на ... і прэзентацыю таленавітай моладзі: ... куратараў, студэнтаў, якія атрымліваю... цыю ў галіне культуры.

У 2022 годзе ўдзел у трыенале ўзялі б... 50 аўтараў да 35 гадоў. Журы ацэньвала ў 8 нам... ях: «Жывапіс», «Графіка», «Скульптура», «Ман...ентальнае і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Мастацкая дынастыя», «Фатаграфія», «Навацыя». Наведвальнікі маюць магчымасць прагаласаваць у межах намінацыі «Сімпатыя гледачоў».

Падтрымка і распаўсюджванне мастацтва — справа вельмі важная, а тым больш датычна маладых аўтараў. У сучасным матэрыяльным свеце вельмі істотна нагадваць пра духоўныя каштоўнасці, якія аб'ядноўваюць.

Адкрыў выстаўку дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, вядомы беларускі мастак і куратар Сяргей Крыштаповіч:

— Я хачу падзякаваць кожнаму аўтару, работа якога ўпрыгожыла наша трыенале. Зычу кожнаму з вас стаць пераможцам, паколькі, на мой погляд, усе работы

Падчас адкрыцця.

вартыя адзнакі і ўвагі. Я магу назваць кожны твор і адзначыць яго асаблівасці, унікальнасць. Заставайцеся маладымі. Прымайце ўдзел у кожным конкурсе, пакуль піша рука і стварае сэрца. Я вельмі рады, што мы зрабілі другі крок, другое трыенале. У нашых маладых мастакоў свой погляд на свет. Беларусь мае добрую ... ...я чарговы раз ...оддзю з дня нара... ...усі Якуба Коласа і Янкі ...ні гэтага года. Як многа ў ...ага! Такое акадэмічнае вяртан... ...яне — вялікае адкрыццё і радасць. ...арусі сфарміравалі XX стагоддзе, будзе ... XXI сфарміруюць нашы суайчыннікі.

Святлана Сізянкова «Стварэнне», 2020 г.

Выступіў перад удзельнікамі і Глеб Отчык, старшыня Беларускага саюза мастакоў:

— Сапраўды, конкурс быў вельмі вялікі. Тры гады таму мы зладзілі Першае трыенале маладых мастакоў з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. Тады пляцоўкай для правядзення выстаўкі стаў Палац мастацтва. Мне не забыць той уздым, натхненне, атмасферу, што панавалі ў зале. А зараз я бачу, наколькі за тры гады падзея стала больш сур'ёзнай і прафесійнай. Сустрэў тут не пачаткоўцаў, а сталых творцаў, якім ёсць што сказаць гэтаму свету. Упэўнены, выстаўку такога ўзроўню можна паказваць і за межамі нашай краіны, прэзентаваць на любых міжнародных пляцоўках і ганарыцца тым, што гэта зрабілі беларусы. Аднойчы ў Італіі да мяне звярнуўся адзін вядомы прафесар фларэнтыйскай акадэміі мастацтваў і сказаў, што ў нашай краіны вялікая будучыня, бо ў нас вельмі таленавітая моладзь. Сёння я магу смела сказаць, што ў нас таленавіты народ.

Як адзначыў Сяргей Крыштаповіч, адбылося пэўнае акадэмічнае вяртанне. Мастакі больш сталыя, змагаючыся з рэалістычным савецкім афіцыёзам, у кантэксце якога існавалі, часам былі вельмі неакадэмічныя.

Дырэктар НЦСМ Сяргей Крыштаповіч.

Намагаліся рабіць супрацьлеглае і выяўляць людзей такімі, што і пазнаць чалавечыя рысы цяжка.

Другое трыенале паказала, што сёння маладыя творцы, наадварот, звяртаюцца да вобраза чалавека, не трансфармуючы яго. Выявы на выстаўцы хутчэй падкрэслівалі вывучэнне і даследаванне вобраза душы праз сапраўдны выгляд, праз постаць і фактуру чалавека, спланаванае пазбяганне скажэння.

Новае пакаленне мастакоў нязмушана імкнецца адлюстроўваць чалавека чыстага, прыгожага, светлага і набліжанага да самой прыроды. Прастата — мастацкі грунт.

Як ніколі актуальныя словы доктара Снаўта з фільма «Салярыс» (1972 г, рэжысёр А. Таркоўскі): «Чалавеку патрэбны чалавек». Свядома ці падсвядома людзі прыходзяць да думкі, што цяпер, калі свет перажывае вялікую трансфармацыю, надышоў момант чалавека павярнуцца да чалавека. Паглядзець на сябе.

Засталіся і традыцыйныя незменныя тэмы, якія працягваюць даследаваць сучасныя мастакі.

Так, мастачка Святлана Сізянкова прадставіла на трыенале сваю карціну «Стварэнне», напісаную ў 2020 годзе. На фоне калейдаскапічных рознакаляровых кавалкаў шкла і матэрыялаў размешчаны дзве рукі. Належаць гэтыя рукі могуць як мастачцы, якая стварае з хаосу свае карціны, так і Богу, які стварае з хаосу сусвет.

Міфалагічны габелен «Гаспадар» аўтарства Анастасіі Падлознай, выпускніцы БДУКМ, адлюстроўвае міфалагічны код беларусаў. Уладар лесу, які і сам зліваецца са сваім царствам, спяшаецца абараняць звяроў, чапляючы даўжэзнай барадой дрэвы і ствараючы буру навокал. Містычныя зялёныя колеры на няроўнай фактуры, зробленай на ткацкім станку, адлюстроўваюць светабудову чалавечай душы. Для мастачкі гэтая работа стала самай доўгай за кар'еру. «Гаспадар» ствараўся 9 месяцаў.

Наведвальнікаў таксама чакаюць лекцыі, сустрэчы, презентацыі, майстар-класы і іншыя мерапрыемствы.

Другое трыенале маладых мастакоў працягнецца да 20 лістапада.

Яна ЦЭГЛА
Фота са старонкі НЦСМ у *Facebook*

14 сустрэч ... Брылеўскай

МАСТАЦТВА ПЯТНІЦА

Беларускі саюз дызайнераў — добра вядомая ў краіне творчая арганізацыя, якая з 1987 года аб'ядноўвае больш за 600 спецыялістаў у сферах індустрыяльнага і графічнага дызайну, праектавання малых форм, інтэр'ераў і абсталявання, рэкламы, арт-дыза... ну, мадэльераў, выкладчыкаў і на... вукоўцаў. БСД мае офіс і галерэю, у якой адбываюцца выстаўкі мастакоў, фатографаў, скульптараў.

У пачатку кастрычніка ў Галерэі Беларускага саюза дызайнераў адбыліся першыя кінапаказы праекта «Стужка14». Асветніцкую праграму маладой генерацыі саюза, якая хоча паглядзець на дызайн з новага ракурсу, распрацавалі і ажыццявілі Яна Кісялей, Святлана Сізянкова, Аліна Першацвет і Яна Сонца.

— Здаецца, што так сышліся зоркі: мне заўсёды хацелася, каб на Брылеўскай, 14 было шмат людзей, — успамінае Святлана, якая з'яўляецца супрацоўніцай Беларускага саюза дызайнераў. — Калі прыйшла працаваць Яна Кісялей, то мы пачалі думаць, як можна развіваць прастору. Было шчырае жаданне не толькі праводзіць выстаўкі, а каб тут увесь час знаходзіліся людзі. Не хапала толькі падтрымкі.

Пасля адной выстаўкі мы пазнаёміліся з Янай Сонца. Яна мела досвед у стварэнні мастацкіх часопісаў, цікавілася дызайнам. Ідэя рабіць кінапаказы ўзнікла імгненна... сустрэліся ў Г... таму і пы... дзем ... т...

...ені ішло ...к будзе вы... ...ралі неабходныя ...вядалі аб сваіх пла... ...у аб'яднання. Старшыня Б... ...а саюза дызайнераў Зміцер Су... падтрымаў ідэю правядзення такіх імпрэз і даў згоду.

— Самым няпростым было скласці спіс фільмаў, — падзялілася ўражаннямі Яна Сонца. — Запланавалі толькі 14 сустрэч, а на абмеркаванні кожная назвала не менш за пяць. Прыходзілася ўважліва слухаць, выбіраць, спрачацца. Мы сутыкнуліся з тым, што часам маем розныя ўяўленні пра дызайн. Яно відавочна, таму што толькі ў Вікіпедыі тлумачэнняў гэтага паняцця не менш за шэсць.

Галоўная мэта праекта — абудзіць цікавасць да дызайну, не толькі паглядзець на яго вачыма розных творчых людзей, рэжысёраў, але і зладзіць абмеркаванне фільмаў, прыйсці да нечага новага. Арганізатары лічаць свой праект не проста асветніцкім, але і агульначалавечым.

— Мы спачатку вырашылі, што асноўная мэта «Стужкі14» — асвятляць актуальныя тэндэнцыі сучаснага дызайну, распавядаць пра гісторыю развіцця



і станаўлення мастацкага кірунку. Але ў гэтых словах шмат навуковага і зусім не адчуваецца жыццё, — падкрэсліла Яна Кісялей. — Тады падумалі, што ўсё-ткі наша ініцыятыва створана для аб'яднання людзей, думак, напрамкаў дзейнасці, чым, як мне падаецца, і з'яўляецца дызайн. Не толькі рэч, але і яе функцыя.

Канцэптуальна «Стужка14» мае адзін сезон, які складаецца з 14 сустрэч. Кожная з іх уяўляе сабой асобны кінапаказ і не звязана з папярэднім. Пасля прагляду гледачы маюць магчымасць застацца і абмеркаваць падзеі фільма, падзяліцца ўражаннямі ад убачанага і агучыць свае думкі пра дызайн. Каляндар фільмаў утрымлівае стужкі і мастацкія, і дакументальныя: розныя гады, розныя тэмы, розныя пытанні. Агульнае адно — панаванне дызайну.

— Я проста ўпэўнена, што зараз галоўная патрэба ў актыўнасці і творчым яднанні. А ад гэтага ўжо ідуць розныя фарматы праектаў, тэмы і г. д., — распавядае Аліна Першацвет. — Асабіста я хацела б больш мультыжанравых праектаў, спалучэння розных напрамкаў мастацтва і імгненнасці. Таму «Стужка14» — гэта і дызайн, і кінематограф, і мастацтва размоў. Шмат працы мастацкай мы ажыццяўляем яшчэ да сустрэчы. Для любога арганізатара, які хоча, каб да яго прыйшлі, істотна напісаць тэкст, каб было ўсё да месца. Афіша сапраўды становіцца мастацкім выказваннем. Як можна прыйсці ў саюз дызайнераў глядзець фільм пра дызайн, калі афіша зроблена няякасна?

Як сцвярджаюць удзельніцы каманды, кінапаказы — толькі пачатак, першыя крокі, каб даведацца, што цікава мінскай публіцы. У далейшых планах — творчае развіццё пляцоўкі: пашыраць «Стужку14», ладзіць выстаўкі маладых, запрашаць на сустрэчы сталых майстроў, якія могуць падзяліцца досведам.

Яна ЦЭГЛА

Таленавіты сібірак з беларуск[illegible] роду

У коле блізкіх людзей вядомы кінаператар, фотамайстар, пісьменнік, цяпер масквіч Анатолій Забалоцкі часам згадвае пра беларускі свой радавод. Што яго дзед па бацькоўскай лініі, Канстанцін Лявонцьевіч, сі[illegible] тою рос ды ў гады Сталыпінскай рэформы перабраўся ў Сібір «аднекуль з-пад Барысава».

Нарадзіўся наш суайчыннік ў Краснаярскім краі 16 верасня 1935 года. І ў лёсе яго — як, відаць, і многіх іншых беларускіх перасяленцаў, іх дзяцей — шмат і страт было, і кардынальных перамен. Расказваючы трохі пра сябе ў кнізе «Шукшын у кадры і за кадрам. Запіскі кінааператара», Анатолій Дзмітрыевіч піша, што «нарадзіўся на цяперашнім дне рукатворнага мора Краснаярскай ГЭС.

Фота Анатолія Забалоцкага.

Наша вёска Сыда была падобная да шукшынскіх Строскаў, тулілася на высокім беразе рэчкі Сыды й рэчкі Узенкі». Праз пяць кіламетраў абедзве рэчкі паглынаў Енісей, маючы ўжо кіламетры два ў шырыню. І на сённяшніх лоцыях для суднавадзіцеляў па Енісеі, удакладняе аўтар, пра «родны кут» яго можна прачытаць: «Урочышча Сыда — месца для ўкрыцця суднаў у час штармоў». Перакрылі Енісей плацінаю, калі Анатолій, закончыўшы школу ў Абакане, сталіцы Хакасіі, ужо вучыўся ў Маскве на кінааператара. Быў на трэцім курсе УДІКа (відаць, 1956 год…), маці напісала яму, што ў былой вёсцы Сыдзе на месцы могілак тоўшча вады аж 29 метраў, і труны пустымі ўсплываюць…

Шмат беларусаў, якія рознымі шляхамі траплялі ў Сібір, аказваліся ў Прыенісейскім краі: жыло там нашых дзясяткі тысяч. У дзеда Канстанціна, згадвае Забалоцкі, было аж дзевяць дзяцей. Нягледзячы на хуткую асіміляцыю нашых суайчыннік[illegible] Усерасій[illegible] заф[illegible]

КІНО СЕРАДА

[illegible] не [illegible]оу і ў [illegible]мяркаванні [illegible]ау: у Мінск, на [illegible]ызнаецца ў мемуа[illegible]и акунуўся ў работу: да [illegible]аваў захоплена, не выкарыс[illegible]ат сваіх адпачынкаў. А кінастудь[illegible], нагадаем, размяшчалася тады пры плошчы Леніна: у Чырвоным касцёле.

Напружаная, без прастояў праца на «Беларусьфільме», зносіны з мясцовымі творчымі людзьмі вярнулі кінааператара — спачатку «авангардна» настроенага, схільнага толькі да «нефігуратыўнага мастацтва» — да рэалізму. Ён ужо зняў фільмы «Апошні хлеб» (1963, рэжысёр Барыс Сцяпанаў), «Праз могілкі» (1964, рэжысёр Віктар Тураў), калі на акцёрскую пробу ў Мінск (у фільм сакурсніка Валянціна Вінаградава) прыязджаў Васілій Шукшын: з ім Забалоцкі быў знаёмы і па інтэрнаце ва УДІКу. І пазней яны зблізіліся, моцна пасябравалі, разам зрабілі знакамітыя фільмы «Печки-лавочки» (кінастудыя імя М. Горкага, 1972) ды «Калина красная» («Мосфильм», 1973).

Згадваючы гады працы на «Беларусьфільме», Забалоцкі радуецца, што тут яму «ўдалося перамагчы малаграматнае лявацтва, прывітае прагрэсіўнай атмасферай УДІКа тых гадоў», набыць у напружанай працы каштоўны досвед. Важнымі дасягненнямі на яго творчым шляху як кінааператара сталі таксама фільмы «Альпійская балада» (1965, рэжысёр Барыс Сцяпанаў — па аднайменнай аповесці Васіля Быкава) ды «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (зняты ў 1967-м, адноўлены ў 1989-м, рэжысёры Уладзімір Бычкоў і Сяргей Скварцоў — па сцэнарыі Уладзіміра Караткевіча). Падчас працы над тымі кінастужкамі ў Забалоцкага склаліся цёплыя, сяброўскія кантакты з Васілём Быкавым, завязалася моцнае сяброўства з Уладзімірам Караткевічам — кінааператар згадвае пра іх у запісах. Дзякуючы Караткевічу Забалоцкі пабачыў шмат чаго цікавага ў Беларусі, здымаючы па сцэнарыі пісьменніка дакументальны фільм «Сведкі вечнасці» пра самыя старыя дрэвы краіны.

У нашых краях Анатолій Дзмітрыевіч пазнаёміўся з Уладзімірам Высоцкім: у 1961-м Віктар Тураў здымаў з Забалоцкім кінанавелу «Зорка на спражцы» (сцэнарый Генадзя Шпалікава паводле апавядання Янкі Брыля), тады ж Высоцкі прыехаў у Мінск па сваіх кінасправах. І з Высоцкім, і са сцэнарыстам і паэтам Шпалікавым бываў Забалоцкі ў кампаніях (у барда ў Беларусі жылі і жывуць блізкія родзічы, а дзед яго, Вольф Высоцкі — з Брэста-Літоўскага родам). Забалоцкі нават [illegible]аваў барда ў Мінску разам [illegible]арынай Уладзі. Радок з мемуараў: «Калі Валодзя бываў у Мінску, мы, натуральна, бачыліся, і ў мяне было вельмі шмат добрых фотакартак — і Валодзі, і Марыны Уладзі». Аднак здымкі тыя не ацалелі. Пра тыя сустрэчы, як і пра іншыя цікавыя моманты жыцця працы ў Беларусі, Анатоль Забалоцкі расказваў журналістам на сустрэчы ў Мінску ў лютым 2020-га. Тады ж і мы гутарылі з ім — на Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, дзе маскоўскі госць прэзентаваў згаданую кнігу пра Васілія Шукшына.

Закончыўся ж «беларускі перыяд» жыцця і творчасці для Анатолія Дзмітрыевіча з вялікімі стратамі ды патрасеннямі. Хоць і была тут плённай яго дзейнасць, і атрымаў званне «Заслужаны дзеяч культуры БССР» (1967), аднак адносіны з кіраўніцтвам «Беларусьфільма» ў сібірака-беларуса не складваліся. Пэўна, бываў ён «упёртым» у адстойванні сваіх поглядаў і перакананняў — і ўсё зайшло, як кажуць, у тупік. У адным з інтэрв'ю расказваў, як прыляпілі яму тут ярлык «антысаветчыка» ды імкнуліся ў рабоце перашкаджаць. «І калі я пасля таго з'ехаў да Шукшына, то яны ўзламалі замок памяшкання, дзе я захоўваў свой архіў, забралі 70 скрынак з плёнкамі ды ўсе фатаграфіі. Сабралі тое ўсё ў кучу — і спалілі! З панятымі склалі акт аб спаленні, узважылі ды забралі серабро з плёнак — і больш нічога не засталося. Вось у тым вогнішчы і загінулі выдатныя фатаграфіі Валодзі Высоцкага, Віці Турава, Гены Шпалікава...»

Вада, агонь, медныя трубы… Праз усё прайшоў наш супляменнік. Родную вёску Анатолія Забалоцкага знішчыла вада. Многія фотаздымкі сямейныя, расказваў мне, самі яго родзічы знішчылі: каб не наклікаць бяды ў пару рэпрэсій. Бо, напрыклад, нехта з радні меў з часоў Першай сусветнай Георгіеўскія крыжы за подзвігі. Быў і здымак некага з роду ў шпіталі — разам з сёстрамі міласэрнасці з імператарскай сям'і. Усё давялося «падчысціць». У 60-я гады аператар ездзіў у Барысаў, шукаў каго з беларускіх родзічаў, ды безвынікова. І па маладосці яго тое — карані роду — мала займала: было шмат іншых клопатаў. Аднак жа і немалы плён іх, яго мінскай творчай працы знішчыў агонь. Прычым, падказвае інтэрнэт, якраз у тыя гады — з 1967-га да 1971-га — уводзіліся ў строй агрэгаты згаданай ГЭС.



Анатолій Забалоцкі.

У хуткім часе пасля таго, як Васілія Шукшына не стала, практычна сышоў з кіно і Анатолій Забалоцкі. Праўда, зняў пазней як аўтар-рэжысёр дакументальны фільм «Слова матери» (1978), дзе ўспамінамі пра сына дзеліцца маці Васілія Шукшына Марыя Сяргееўна. Пабачыць фільм яна не паспела. Забалоцкі пісаў неяк, што кінаплёнку і камеру на чатыры дні пад той фільм яму выдзелілі на «Беларусьфільме». І на пачатку невялічкай, на 18 хвілін стужкі, бачым адметную застаўку вядомага творчага аб'яднання «Летапіс». Урэшце ж кінааператар (зняў ён 15 фільмаў) з 1977 года пераключыўся на іншую працу і з часам набыў славу «легендарнага фотамайстра», выпусціў альбомы, афармляў кнігі, зрабіў нямала фотавыставак. Шмат здымае ў расійскай глыбінцы, працаваў з Валянцінам Распуціным, Віктарам Астаф'евым, Фёдарам Абрамавым… І «на след» Анатолія Забалоцкага выйшаў я дзякуючы кнігам ды маім піцерскім аднакашнікам. Гэта вядомы дэпутат Дзярждумы Расіі, пісьменнік Анатолій Грашневікоў і яго памочнік Мікалай Панасенка. Праз пісьменніка Васілія Бялова абодва ведаюць нашага супляменніка, даслалі мне шэраг цікавых кніг. Сярод іх аказаўся і ўнікальны фаліянт Васілія Бялова «Лад. Нарысы пра народную эстэтыку» (з цудоўнымі фотаздымкамі Анатолія Забалоцкага) ды згаданыя ўспаміны кінааператара пра Шукшына. Праз пасрэдніцтва Мікалая Панасенкі мы і сустрэліся ў Мінску з Анатоліем Забалоцкім. Цяпер, піша мне сябар, 87-гадовы Анатолій Дзмітрыевіч няважна сябе пачувае. То пажадаем суайчыннику здароўя!

Фота Анатолія Забалоцкага.

Валянцін Распуцін.

Іван ЖДАНОВІЧ

Фота з сайта *pravoslavie.ru*



Фота Анатолія Забалоцкага.

Фота Анатолія Забалоцкага.

Крок за крокам. Год за годам

Народнаму музею гісторыі Мар'інагорскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа — 55!

Радзіма пачынаецца з той мясціны, дзе нарадзіўся, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва. А любоў да радзімы пачынаецца з любові да родных мясцін, з імкнення даведацца іх гісторыю. Выкладчыкі і навучэнцы Мар'інагорскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа, жыхары пасёлка Мар'іна збіраюць і клапатліва захоўваюць летапіс малой радзімы ў народным музеі гісторыі ўстановы адукацыі.

Сёлета наша ўстанова адукацыі адзначыла 146 гадоў са дня свайго заснавання. Музей, які адлюстроўвае гісторыю станаўлення і развіцця найстарэйшай спецыяльнай установы нашай краіны, быў створаны 56 гадоў таму, у далёкім 1966 годзе, Рыгорам Ільічом Грабчыкавым. Рыгор Ільіч у той час працаваў намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце, быў вельмі апантаны захаваннем памяці пра ўстанову з такой багатай і цікавай гісторыяй. Яму было 12 гадоў, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Успаміны пра тыя жахлівыя часіны не адпускаюць яго і зараз. Таму спачатку ён думаў стварыць экспазіцыю, якая б адлюстроўвала ваенныя падзеі ў лёсах выкладчыкаў, выпускнікоў, навучэнцаў, у гісторыі пасёлка. Наладзіўшы сувязь з выпускнікамі, ён атрымаў шмат цікавага матэрыялу пра ранейшы перыяд існавання вучэбнай установы. Стаў працаваць у Нацыянальным архіве і адшукаў вялікую колькасць фактаў, што ўказваюць на ўнікальнасць гісторыі альма-матэр, якая пачыналася з Мар'інагорскай сельскагаспадарчай школы, а сёння мае ганаровую назву «Мар'інагорскі дзяржаўны ордэна "Знак Пашаны" аграрна-тэхнічны каледж імя У. Е. Лабанка».

За 146 гадоў існавання ўстановы адукацыі яе назва мянялася трынаццаць разоў. Трынаццаць радкоў на стэндзе адкрываюць прастору для творчасці сучасных навучэнцаў, якія любяць каледж, пасёлак, захапляюцца гісторыяй, імкнуцца яе спазнаць, захаваць і распаўсюдзіць. Сёння музейны фонд налічвае каля трох тысяч экспанатаў. У 2018 годзе музей атрымаў званне «Народны». Экспазіцыя ўключае пастаянныя раздзелы: «Гісторыя станаўлення сельскагаспадарчай школы», «Дарэвалюцыйнае развіццё ўстановы адукацыі», «Дзейнасць установы адукацыі ў 1917—1945 гг. Подзвіг Міхаіла Рудовіча», «Установа адукацыі ў час ваеннага ліхалецця. Герой Савецкага Саюза Уладзімір Елісеевіч Лабанок», «Пасляваеннае аднаўленне», «Добры прыклад — іншым навука (знакамітыя выпускнікі)», «Этнаграфічны куток», «Творчая спадчына выкладчыкаў каледжа».

Мы стараемся прадставіць усе знойдзеныя цікавосткі, таму да знакавых падзей ствараем часовыя выстаўкі. Так, у мінулым годзе абнавілі змест экспазіцыі «Героі не паміраюць…», прысвечанай подзвігу Міхаіла Рудовіча — навучэнца каледжа, чыё імя носіць не толькі цэнтральная вуліца ў пасёлку Мар'іна, але і чытальная зала бібліятэкі каледжа. Музейны фонд папоўніўся копіямі газетных артыкулаў 1925 і 1957 гадоў, якія адшукалі ў Нацыянальнай бібліятэцы. Цяпер, у Год народнага адзінства, гэты матэрыял вельмі запатрабаваны. І постаць самога героя, і ўсё, што звязана з яго партызанскай дзейнасцю, зацікавіла сродкі масавай інфармацыі — нашы матэрыялы выкарыстаны для стварэння некалькіх рэпартажаў.

Да 145-годдзя з дня заснавання каледжа афармілі дзве экспазіцыі, якія дзейнічаюць пастаянна. «Адданасць прафесіі» прысвечана Сцяпану Туркіну — аграному, які двойчы закончыў нашу ўстанову адукацыі: спачатку сельскагаспадарчае вучылішча, а праз некалькі гадоў — сельскагаспадарчы тэхнікум. Жыццё гэтага чалавека напоўнена рознымі падзеямі — і радаснымі, і сумнымі, але ўсяго сябе ён прысвяціў абранай

Заснавальнік музея Рыгор Ільіч Грабчыкаў.

у юнацтве прафесіі. Яго ўнук — кампазітар Міхаіл Святлоў — перадаў нам цікавыя дакументы з сямейнага архіва, якія гарманічна дапоўнілі тыя, што ў нас былі. Атрымалася вельмі захапляльная экспазіцыя, якая поўна адлюстроўвае жыццёвы і працоўны шлях выпускніка: арыгінальныя дакументы, узнагароды, фотаздымкі, асабістыя рэчы. А пачынаецца знаёмства з кнігі з подпісам кіраўніка ўстановы адукацыі, якую атрымаў за выдатныя веды Сцяпан Туркін падчас вучобы.

Экспазіцыя «Калючыя ружы лёсу Захара Біралы» прысвечана нашаму земляку, беларускаму паэту-сатырыку, які доўгі час працаваў у тэхнікуме выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры. Дзеці паэта перадалі ў музей сямейны архіў. Асаблівае захапленне выклікаюць аўтографы паэта, яго рукапісы і дакументы, асабістыя рэчы. Пачэснае месца займаюць і кнігі з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў, з якімі сябраваў Захар Якаўлевіч.

Экспазіцыйныя вітрыны і стэнды музея змяшчаюць арыгіналы, копіі архіўных дакументаў пазамінулага і мінулага стагоддзяў, фотаздымкі, кнігі, падручнікі, макеты, сродкі для арганізацыі адукацыйнага працэсу на розных этапах існавання ўстановы адукацыі. У народным музеі дэманструюцца прадметы працы і побыту, якімі карысталіся ранейшыя навучэнцы і супрацоўнікі.

Цікавасць наведвальнікаў заўсёды выклікаюць каштоўныя экспанаты музея: медалі, заваяваныя на міжнародных сельскагаспадарчых выстаўках; гербарый шкодных раслін, сабраны першымі навучэнцамі школы; узнагароды і асабістыя рэчы Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Елісеевіча Лабанка — выпускніка, чыё імя носіць каледж; асабістыя рэчы і дакументы Валянціна Андрэевіча Свірыдава — выпускніка, які быў дырэктарам нашай установы адукацыі.

Унікальнай можна лічыць і выстаўку «Вучэнне — шлях да ўмення», дзе дэманструюцца дакументы і вучнёўскія прылады Уладзіміра Дарафеевіча Рошчына — выпускніка, які пазней доўгі час працаваў выкладчыкам. Яны адлюстроўваюць вучнёўскі шлях будучага агранома ад паведамлення аб залічэнні да дыплома з адзнакай. Прыемна бачыць усмешку на тварах наведвальнікаў, калі яны заўважаюць «памочнікаў у вучобе» — шпаргалкі навучэнца, які атрымліваў веды ў пачатку 1960-х гадоў.

У народным музеі гісторыі ўстановы адукацыі працуе аб'яднанне па інтарэсах «Старонкі гісторыі», якое з задавальненнем наведваюць навучэнцы. Вялікую падтрымку і сапраўдную дапамогу аказваюць былыя супрацоўнікі каледжа. Усе творчыя праекты, падрыхтаваныя для ўдзелу ў разнастайных акцыях, конкурсах, адзначаныя дыпломамі, граматамі, сертыфікатамі, грунтуюцца на мясцовым матэрыяле. Гісторыя каледжа, сабраная людзьмі розных пакаленняў і прадстаўленая ў музеі, адлюстроўвае ўсе значныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі нашай краіны. Навучэнцам цікава «прымяраць» вядомыя факты на гісторыю малой радзімы. Найбольшую цікавасць выклікаюць тыя моманты, сведкі якіх знаходзяцца побач з намі. Таму раздзел праграмы «Гутаркі са сведкамі гісторыі» — адзін з самых запатрабаваных. Слухаючы шчырыя аповеды былых супрацоўнікоў, шматлікіх выпускнікоў пра мінулае каледжа, мы разумеем, што чым больш ведаў пра родныя мясціны ўжо маем, тым больш шануем і любім малую радзіму — месца, дзе зрабілі першыя крокі ў дарослае жыццё.

Сучасны музей немагчымы без тэхнічных і тэхналагічных дасягненняў. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій дазваляе вырашыць шматлікія задачы, што стаяць перад тымі, хто хоча далучыцца да гісторыі. Стварэнне сайта музея гісторыі ўстановы адукацыі (*http://museum.mgatk.by*) прынесла сваю карысць: мы знайшлі сяброў з розных куткоў свету — гэта не толькі выпускнікі, але і іх сваякі, якія дапамагаюць пісаць нашу агульную гісторыю — гісторыю людзей і падзей, якіх лёс парадніў у Мар'інагорскім дзяржаўным аграрна-тэхнічным каледжы. Нядаўна стварылі профіль музея ў *Instagram — Muzei145*, абазначыўшы лейтматыў дзейнасці «Злучаем мінулае, сучаснае і будучае».

Крок за крокам мы разам ідзём па доўгім шляху гісторыі каледжа, дзень за днём адкрываючы ўсё новыя і новыя факты, каб асэнсаваць іх, апрацаваць і захаваць на доўгія гады.

Алена СВІРЫДАВА,
выкладчык, кіраўнік народнага музея гісторыі Мар'інагорскага аграрна-тэхнічнага каледжа
Фота даслана аўтарам

Там, дзе спела майстэрства

Разглядаючы карту літаратурнага краязнаўства Міншчыны, Чэрвеншчыны, нельга абысці ўвагай імя ўраджэнца Чэрвеня Лазара Шапіры (1928—2006), чый зямны шлях завяршыўся ў Тэль-Авіве.

Першая яго кніга «Хлопчык з ліхтарыкам» — пабачыла свет у 1960 годзе ў Петразаводску. У Карэльскім кніжным выдавецтве. Як жа туды трапіў наш зямляк?..

Бацька Лазара быў спецыялістам у галіне лясной гаспадаркі. І ў пачатку 1930-х гадоў сям'я пераехала ў Карэлію. Можна толькі ўявіць, колькі блізкіх ім людзей засталося на Чэрвеншчыне, Пухавіччыне і загінула ў полымі Вялікай Айчыннай вайны… Яўрэяў расстрэльвалі ў Смілавічах, Чэрвені, Дукоры, Пухавічах, іншых мясцінах старажытнай Ігуменшчыны, дзе яны дагэтуль жылі ўжо не адно стагоддзе.

Лазар Шапіра ў 1952 годзе закончыў Петразаводскі дзяржаўны ўніверсітэт. Па размеркаванні быў накіраваны на працу ў школу сяла Вядлозера. Дырэктарам там працаваў Урха Руханен. Вядлозера — старадаўняе карэльскае сяло, адміністрацыйны цэнтр Вядлозерскага сельскага паселення Пражынскага нацыянальнага раёна Рэспублікі Карэлія. Недзе каля тысячы жыхароў. Тут працуе племсаўгас. Ёсць лясніцтва. Ёсць у Вядлозеры і Дом культуры, бібліятэка… У 2013 годзе тут арганізаваны Дом карэльскай мовы. Праз паселішча пралягае Блакітны турыстычны маршрут (Швецыя — Нарвегія — Фінляндыя — Расія). Вёска размешчана на паўночна-ўсходнім беразе возера Вядлозера, у якое ўпадае рака Вохта… Вось у такіх прыгожых, цікавых, са шматнацыянальным складам насельніцтва мясцінах спеў, фарміраваўся мастацкі талент нашага земляка.

У Вядлозеры Лазар Шапіра пасябраваў з дырэктарам школы. Урха Руханен — вядомы карэльскі пісьменнік. Яшчэ ў 1930-я гады працаваў адказным сакратаром фінскага часопіса ў Петразаводску. Склаў шэраг падручнікаў і хрэстаматый для фінскіх школ Савецкага Саюза. Перакладаў на фінскую мову вучэбную і мастацкую літаратуру. У 1937-м быў звольнены з працы і выключаны з Саюза пісьменнікаў СССР. У 1938 годзе Урха Руханена арыштавалі і да 1946-га ён знаходзіўся ў мясцінах зняволення. У 1947 годзе, пасля вызвалення, прыехаў у Вядлозера, дзе і працаваў дырэктарам школы да 1961-га. У сакавіку 1956 года пісьменніка і педагога рэабілітавалі. У хуткім часе ён пераехаў у Петразаводск… Дарэчы, Урха Руханен — перакладчык на фінскую мову і твораў класікаў беларускай літаратуры Якуба Коласа, Васіля Быкава. Перакладчыцкім заняткам сябра Лазара Шапіры спрыяла і тое, што ён працаваў у Петразаводску ў фінскай рэдакцыі вядомага выдавецтва «Прогресс».

…У 1960—1970-я гады ў Петразаводску выйшлі многія дзіцячыя кнігі Лазара Шапіры — «Мае знаёмыя», «Добра,

Ілмары!», «Так яно і было», «Добрай раніцы», «Строгі настаўнік», «Пра мяне і пра ўсіх»… Крытыка адносіла гэтыя творы да «добрай літаратуры».

У 1993 годзе наш зямляк пераехаў у Ізраіль. Доўга хварэў, у апошнія гады жыцця аслеп. І памёр у 2006-м у Тэль-Авіве. Час ад часу асобныя апавяданні Лазара Шапіры друкуюцца ў вучэбных дапаможніках, хрэстаматыях і цяпер.

Раман СЭРВАЧ

Умаёй хатняй бібліятэцы, канешне, ёсць не толькі Збор твораў народнага песняра Янкі Купалы. Набыў і некаторыя асобныя выданні Івана Дамінікавіча. Аднак кніга выбранага «Паэмы і драматычныя творы» для мяне асабліва каштоўная. Чым — відаць па надпісе на ёй: «Вялікі дзякуй за цікавую сустрэчу. Плёну Вам у працы і моцнага здароўя. Вучні Морацкай сярэдняй школы».

Морач — вёска талентаў

Уражанні, што не забываюцца

На гэтай сустрэчы я прысутнічаў як карэспандэнт штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». З якой нагоды і калі паездка была — забылася. Але па годзе выдання гэтага аднатомніка — 1989-ы — мяркую, што стала адной з апошніх, якія Цэнтральны камітэт Кампартыі Беларусі некалі рэгулярна праводзіў для творчых работнікаў рэспублікі для лепшага азнаямлення з працоўнымі калектывамі. Не абміналіся ў час паездак і школы. Гэтая сустрэча на Клеччыне праходзіла ў перыяд так званай перабудовы.

Уражанняў было шмат. З найбольш памятных — і наведванне Морачы. Здзівіла прыгажосць тамашняй прыроды. Цікава было даведацца пра гісторыю вёскі, якая ўзнікла ў сярэдзіне XV стагоддзя, калі, паводле летапісу, вялікі князь літоўскі Казімір IV даў «на рацэ Морач зямлю І. Вяжэвічу і 10 людзей». З сярэдзіны XVII Морач налічвала 32 гаспадаркі і належала Радзівілам. А царкоўнапрыходская школа ў ёй была адкрыта ў 1903 годзе.

Будынак жа той, куды мы наведаліся, яшчэ здалёку ўражваў сваёй прыгажосцю. Спраектаваны ў выглядзе вялікага карабля, нібы нагадваў, што вучні на ім паспяхова «паплывуць» у краіну ведаў. Сапраўды, па запэўніванні настаўнікаў, яны няблага займаліся па ўсіх прадметах. Не верыць ім не было падстаў, бо ў час сустрэчы панавала атмасфера шчырасці, жадання больш расказаць не толькі пра школу. А наколькі вучні любяць беларускую літаратуру — і самі ўпэўніліся.

Ад настаўнікаў даведаліся і пра тое, якой вялікай папулярнасцю карыстаецца мясцовы народны хор. Не толькі на Клеччыне. І не ў адной Беларусі, а і за яе межамі. Самадзейныя артысты аднойчы нават выступалі на мерапрыемстве, на якім прысутнічаў першы сакратар Цэнтральнага камітэта Кампартыі Савецкага Саюза Мікіта Хрушчоў. Пазней я расказаў пра гэты самабытны калектыў у матэрыяле, прысвечаным культурнаму жыццю Клеччыны, змешчаным у часопісе «Маладосць». З не меншым задавальненнем раблю гэта і цяпер.

«Пагарэлыя»? «Бульбу» паслухайце!

Асабліва натхнёна марачанцы спяваюць, калі хораша на душы. Такі цудоўны настрой быў у іх і пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Песні выконвалі з рознай нагоды: жанчыны ў час жніва, мужчыны — за святочным сталом. Без песні не абыходзіліся вяселлі, розныя святы, ды і вячоркі пасля працоўнага дня. Спявалі і тыя, у каго не ўсе дачакаліся мірнага дня. Толькі песні ў іх былі зусім не радасныя.

Даўно забылася, у каго першага з'явілася думка сабрацца разам. Ды і выступіць перад аднавяскоўцамі. А энтузіястаў набралася нямала — 18 юнакоў і дзяўчат. Стараліся першым жа сваім выступленнем, а яно адбывалася ў памяшканні школы, як мага лепш заявіць пра сябе. На працяглыя воплескі не разлічвалі, але і не чакалі, што будзе рэзка супрацьлеглая рэакцыя. Толькі пачалі спяваць, як хтосьці засвістаў, іншыя застукалі нагамі. Яшчэ і артыстамі з пагарэлага тэатра назвалі. Дзяўчаты ад такой няўдзячнасці нават заплакалі. Але большасць харыстаў здавацца не збіраліся. Хтосьці прапанаваў:

— Заспяваем «Бульбу»!

І загучала тое, што ўсім было блізкае і знаёмае. Нават слухачы-песімісты не стрымаліся, пачалі пляскаць.

Канцэрт прайшоў вясной 1946 года. Часам яго і называюць годам нараджэння Морацкага хору. Аднак гэта памылкова.

Яўгенія Піліпеня.

Першы калектыў праіснаваў нядоўга, хутка распаўся. Толькі канчаткова добрая справа не згасла. Працяг адбыўся ў 1951 годзе, калі, звольніўшыся з войска, у родную вёску вярнуўся Яўген Абабурка. Да песні ахвотны, добры арганізатар, даведаўшыся, што землякі ўжо спрабавалі стварыць хор, узяўся аднавіць яго. Словы не разышліся са справай. За кароткі час згуртаваў 45 чалавек, гэтак жа, як і сам, улюбёных у песню. Ужо праз год, выступіўшы на раённым свяце песні і працы, харавы калектыў з Морачы у новым складзе аказаўся адным з найлепшых. А 1953-й стаў афіцыйным годам заснавання Морацкага хору.

Яшчэ з большым майстэрствам мясцовыя артысты выступілі на абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці. Паспяхова прайшлі гастролі і ў суседніх з Клецкім раёнах. Спрыяў вядомасці марачанскіх харыстаў і ўдала падабраны рэпертуар. Творы прафесіяналаў суседнічалі з песнямі самадзейнага клецкага кампазітара Міхаіла Кашубы, напісанымі на словы тутэйшых аўтараў. Міхаіл Іосіфавіч стварыў і ўласны калектыў — ансамбль народнай музыкі «Бацькаўшчына».

Новы кіраўнік — новае дыханне

Прафесійныя творцы аказалі Яўгену Абабурку і практычную дапамогу. Асабліва кампазітар Дзмітрый Лукас, які неаднойчы прыязджаў у Морач. Кансультаваў не толькі кіраўніка хору, але і выканаўцаў. Восенню 1962 года прысутнічаў на раённым аглядзе мастацкай самадзейнасці. Ад марачанцаў застаўся ў захапленні. Сваімі думкамі падзяліўся ў «ЛіМе»: «Маладыя галасы, яркія святочныя нацыянальныя касцюмы, разнастайны рэпертуар. Паўнюткая глядзельная зала Дома культуры пасля кожнай песні, якую выконваў Морацкі хор, выбухала гарачымі заслужанымі апладысментамі. Зладжаны калектыў пад кіраўніцтвам вялікага аматара харавога народнага спявання Я. Абабуркі многа папрацаваў над рэпертуарам».

У 1963 годзе хору было прысвоена ганаровае званне «Народны». Аднак, хоць калектыў і атрымаў заслужанае прызнанне, быў і зваротны бок медаля. Асноўная прычына ў тым, што артыстаў ад рэпетыцый і выступленняў адрывалі сезонныя работы. Калі ж халасцякі заводзілі сем'і, заставалася мала вольнага часу. Таму асобныя з іх пакідалі калектыў. Ды і пасля Яўгена Абабуркі пастаяннага кіраўніка не было.

Другое дыханне з'явілася пасля таго, як у канцы 1980 года хор узначаліла Яўгенія Піліпеня. Выпускніца Мінскага музычнага вучылішча імя М. І. Глінкі адразу акунулася ў блізкую ёй творчую атмасферу, бо скончыла аддзяленне харавых спеваў. Знайшла паразуменне са старшынёй тагачаснага калгаса «Прагрэс» Аляксандрам Дылеўскім. Менавіта Аляксандр Іосіфавіч прыклаў і шмат намаганняў, каб Морач стала Мораччу. Па сутнасці, пры ім пачалі закладвацца асновы аднаго з сучасных пасёлкаў на Беларусі, якім знойдзена трапнае вызначэнне — аграгарадок.

Відаць, цікава, адкуль такая назва — Морач? Прасцей правесці аналогію са знакамітым морам Герадота. Аднак старажытнагрэчаскі гісторык, якога Цыцэрон трапна назваў «бацькам гісторыі», тут ні пры чым. Не толькі таму, што хоць мора гэтае, па перакананні Герадота, і знаходзілася на месцы цяперашняга Палесся — ад Слоніма да Пінска і ад Брэста да Мазыра, Клеччыны яно не дасягала. Ды і адкуль нашым продкам было пра яго ведаць, калі па сёння няма пэўнасці ў яго існаванні. Але, разам з тым, яно і было. Морам палешукі называлі балоты, якія маглі праглынуць кожнага, хто праявіў неасцярожнасць. Ды і камароў вадзілася столькі, што маглі выпіць у чалавека ўсю кроў. Значыць — замарыць яго. Мора, замарыць — вось вам і Морач. Хай сабе і так.

Вучыцца ніколі не позна

Мора ў Морачы Аляксандр Дылеўскі, зразумела, не заспеў. Ды калі ў канцы жніўня 1977 года яго прывезлі «сватаць» у старшыні калгаса, на месцы цэнтра цяперашняга аграгарадка жанчыны рассцілалі лён. Такому пейзажу ён, праўда, асабліва не здзівіўся. Сам жа таксама мясцовы, нарадзіўся на хутары каля вёскі Крацк. Аднак разумеў, што ў сучасным населеным пункце павінны быць сучасныя ўмовы і для працы, і для адпачынку. А які адпачынак без песні? Заўважыўшы, што да харыстаў вяртаецца былая слава, заспявалі і некаторыя калгасныя спецыялісты.

32 гады працавала Яўгенія Піліпеня ў Морачы. Народны хор стаў для яе тым дзецішчам, без якога немагчыма ўявіць жыццё. Дзякуючы Яўгеніі Ніканаўне, гэты самабытны калектыў не толькі пастаянна павышаў выканальніцкае майстэрства — ён стаў і творча-практычнай школай для гэтакіх жа энтузіястаў. Пастаянна ладзіліся практыкумы кіраўнікоў харавых і фальклорных калектываў.

Вучыліся ў Яўгеніі Ніканаўны і тыя, у каго ўжо было высокае майстэрства, аднак народнага хору яны ў нечым не дацягвалі. То хіба можна было не паехаць у Морач павучыцца, калі Яўгенію Ніканаўну пастаянна ставілі ў прыклад такія знаўцы беларускага песеннага фальклору, як Генадзь Цітовіч, Анатоль Бальцэвіч, Віктар Бабачкін, Тамара Варфаламеева.

Марачанцы перамагалі ў самых прэстыжных конкурсах. Выходзілі музычныя альбомы з запісамі іх выступленняў. Неаднойчы прысвячаліся ім тэлеперадачы. Годна адчувалі яны сябе і на Рэспубліканскім фестывалі харавога мастацтва «Пеўчае поле» ў Мядзеле. Адтуль заўсёды вярталіся з дыпломамі, стаўшы лаўрэатамі.

Дбаючы аб папаўненні хору маладымі выканаўцамі, Яўгенія Піліпеня рыхтавала змену. З вучняў мясцовай школы стварыла ансамбль народнай песні «Марачаначка», які ў 1997 годзе атрымаў званне «Узорны». А ў фальклорнай групы «Спадчына», як і ў самога хору, багатыя творчыя традыцыі. Яна нават старэйшая па ўзросце, працуе з 1950 года.

Яўгеніі Ніканаўны не стала ў 2014 годзе. Тое добрае, што зрабіла яна, працягваецца ў новых справах і здзяйсненнях. У іх жыве і памяць аб гэтым цудоўным чалавеку. Марачанскі СДК носіць яе імя — заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Яўгеніі Піліпені.

Хата — мінулым багатая

Сённяшняя Морач — аграгарадок. Адначасова — свайго роду культурная сталіца Клеччыны. У вёсцы працуе раённы Цэнтр рамёстваў. Для яго спецыяльна не ўзводзілі будынак, а адрамантавалі старую вясковую хату. Яна так і дажывала б свой век, маўкліва скардзячыся на нялёгкую долю. А цяпер забылася пра паважаны ўзрост. На вачах памаладзела, хоць у душы засталася тою ранейшаю, дзе гаспадарыла рупная жанчына, якая была выдатнай ткачыхай. У гэтым можна было ўпэўніцца, толькі ўвайшоўшы ў першы пакой.

Людзі сталага ўзросту, трапіўшы ў яго, многае прыпомняць са свайго маленства. А для моладзі гэта будзе ў навінку, стане адкрыццём таго, як жылі некалі рупныя вяскоўцы. Падлога ў пакоі заслана дыванамі. Сцены, як і здаўна ў сялянскіх хатах, упрыгожаны вышыўкамі. У прадчуванні звыклай для яго працы сцішыўся ткацкі станок. Пад вечар ці ў выхадны дзень жанчына сядзе за яго, пачне ткаць.

У наступным пакоі — працяг гэтай бытавой ідыліі. Позірк адразу запыняецца на чырвоным куце. На ім сем абразоў з ручнікамі, аздобленымі квяцістымі ўзорамі. Азіраешся па баках — таксама ўсё, як у сапраўднай хаце. Ложак акуратна заслана вышытымі прасцінамі. Печ зачакалася, калі напаляць яе, бо хоча хутчэй высушыць памытыя кашулі, якія вісяць на вяроўцы.

Праўда, некалькі гадоў таму здарылася няшчасце. Адбыўся пажар, шмат экспанатаў было незваротна страчана. Давялося для Цэнтра рамёстваў прыстасоўваць іншы будынак. У ім па-ранейшаму шмат робіцца для захавання традыцыйнай беларускай культуры. Працуюць гурткі жывапісу, вышыўкі, саломі і лозапляцення, лепкі з гліны, мастацкай апрацоўкі драўніны. Пры ім адкрыты клуб «Майстры», у які ўваходзяць 18 пастаянных удзельнікаў найвышэйшага прафесіяналізму. Іх аб'яднанне таксама мае званне народнага.

Відаць, цікава, адкуль такая назва — Морач? Прасцей правесці аналогію са знакамітым морам Герадота. Аднак старажытнагрэчаскі гісторык, якога Цыцэрон трапна назваў «бацькам гісторыі», тут ні пры чым. Не толькі таму, што хоць мора гэтае, па перакананні Герадота, і знаходзілася на месцы цяперашняга Палесся — ад Слоніма да Пінска і ад Брэста да Мазыра, Клеччыны яно не дасягала. Ды і адкуль нашым продкам было пра яго ведаць, калі па сёння няма пэўнасці ў яго існаванні. Але, разам з тым, яно і было. Морам палешукі называлі балоты, якія маглі праглынуць кожнага, хто праявіў неасцярожнасць. Ды і камароў вадзілася столькі, што маглі выпіць у чалавека ўсю кроў. Значыць — замарыць яго. Мора, замарыць — вось вам і Морач. Хай сабе і так.

Ганаровы статус «Народны» і ў школьнага этнаграфічнага музея «Гісторыя вёскі Морач». Для збяражэння нацыянальнай спадчыны, традыцый тут таксама робіцца шмат. Школа пасля таго, як да яе далучылі мясцовы дзіцячы сад, стала называцца ДУА «Морацкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа».

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Простыя рэчы

Бачыць унутраны… …

РЭПАРТАЖ ПЯТНІЦА

Таццяна Чараухіна вядома ў Гомелі і далёка за яго межамі пад псеўданімам Дар'я Дарошка. Знаёмы з ёй і чытачы «ЛіМа» па паэтычных публікацыях. Лірычная гераіня Дар'і — датклівая, тонкая, кранальная, чулая асоба. Гледзячы на фота паэтэсы, дзе яна — маладая і прыгожая — у вялікіх цёмных акулярах, — міжволі падумаеш: гэты аксесуар — даніна модзе… Насамрэч Дар'я страціла зрок, але гэта не стала перашкодай для творчасці. Сёння размова пра тое, што, як бы ні складваўся лёс, заўжды можна ўзняцца над няпростымі абставінамі…

Дар'я Дарошка.

— Дар'я, раскажыце, як захапленне тэатрам прыйшло ў ваша жыццё.

— З дзяцінства любіла глядзець фільмы, тэлеспектаклі, слухаць радыёспектаклі — паступова ўзнікла жаданне і самой паспрабаваць сябе ў акцёрскім майстэрстве, адчуць, што гэта такое — быць на сцэне. Маці прывяла мяне ў гарадскі цэнтр культуры — мне тады было 8 гадоў. Трохі выступала там, потым — у іншых тэатральных гуртках. З трынаццаці гадоў наведвала драмтэатры — па чатырыпяць разоў глядзела кожную пастаноўку. Увесь рэпертуар ведала на памяць, многія моманты прадбачыла. Былі і любімыя акцёры. Але паступаць вучыцца на актрысу не насмелілася — пайшла ў медыцыну. Адпрацаваўшы колькі часу медыцынскай сястрой, паступіла на філфак... Ды ўвесь час лавіла сябе на тым, што жаданне тое даўняе «свярбіць», не знікае. У рэшце рэшт пагрукалася ў тэатр лялек: прайшла кастынг і стала там працаваць, што працягвалася некалькі гадоў, але здароўе станавілася ўсё горш і горш… Давялося звольніцца. Уладкавалася ў бібліятэку — працаваць там было прасцей… Цяпер займаюся толькі самадзейнасцю. Працягваю наведваць гарадскія тэатры — у асноўным, слухаю пастаноўкі. Уяўленне хапае, каб усё гэта «ўбачыць» унутраным зрокам. Пра многае здагадваюся. Людзей гэта здзіўляе: маўляў, так яно і было!

— А што, на вашу думку, галоўнае ў прафесіі акцёра?

— Для мяне гэтая прафесія адна з самых цікавых. Зразумела, што такое быць акцёрам, толькі пасля сарака гадоў, ужо будучы невідушчай.

…у- …рэшце …ы творыш …аш, усёй сваёй …найгалоўнейшае — …табе ўдаецца перадаць …рэжысёр, тое, што ты сама …адчуваеш. То-бок, не толькі ад-, але і перадаць. Каб гэта не толькі …бачылі, але і адчулі ўсёй душой гледачы — узровень зусім іншы.

— А якая ваша гераіня? Драматычная ці больш камедыйная?

— Хаця я і працавала ў тэатры лялек, адчуваю сябе драматычнай актрысай. Вельмі люблю глыбокія псіхалагічныя ролі. У нечым нават трагедыйныя. У мяне ў спектаклі «Споведзь на мяжы трылера» ў тэатры «Інклюзіён» была роля трагічнай жанчыны: яна страціла розум, калі аслепла. Пайшла нават на забойствы, была нарка- і алказалежнай, а напрыканцы загінула… То-бок, уся гэтая гісторыя вядзе да высновы, што не трэба пакідаць чалавека сам-насам, калі з ім здараецца нешта кепскае. Люблю такія ролі… Яны дапамагаюць мне.

— Ці згодны вы з тым, што кожная жанчына ў паўсядзённым жыцці павінна быць хаця б трошачкі актрысай?

— Яно так і ёсць! Дый не толькі жанчына — мужчына таксама! А дзесьці і жывёлы: якія ўмільныя вочкі яны часам робяць, каб атрымаць ласунак! Гэта ў нашай прыродзе. У чымсьці мы як малпачкі (смяецца. — **Заўв. рэд.**).

— Ці дапамагае тэатр пераадолець складаныя абставіны?

— Гэта жыццё, як яно ёсць. Дзе ёсць і мая слепата, і тэатр, і вершы — вось так яно і ідзе. А справіцца з гэтым найперш дапамагаюць мой муж (у суаўтарстве з мужам, паэтам Уладзімірам Чараухіным, у Дар'і выйшлі тры зборнікі: «Не наступайце птушцы на крыло», «Альтанка» і «Маяк». — **Заўв. рэд.**), сябры і бацькі. Маё светаадчуванне: я сама, мае вершы, мой тэатр, мае сны, маё ўяўленне.

— Чым займаецеся цяпер?

— «Інклюзіён» паўтара года як у мінулым. Цяпер я — сярод здаровых людзей, прывучаю іх да сябе. Гэта народны тэатр «ДК "Фэст"». У мяне ролі ў звычайных спектаклях.

— Можна яшчэ на завяршэнне колькі слоў пра гісторыю вашага псеўданіма — Дар'я Дарошка?

— Гадоў дзесяць таму зразумела, што хачу псеўданім. Паэты — людзі вельмі ўраўлівыя, ранімыя. І калі цябе крытыкуюць і называюць тваім уласным імем, — гэта балюча. А калі я чытаю, напрыклад, што «спадарыня Дар'я напісала так і так, па сутнасці, яна здзейсніла паэтычнае самагубства», гэта ўжо не крыўдзіць… З дзяцінства падабалася імя Дар'я, нават кніжка была ў маленстве — «Пра нашу Дашу» — з выявай прыгожай дзяўчынкі з яблычкам у руцэ на вокладцы. Пыталася ў маці: чаму пра нашу Дашу, а не пра нашу Танюшу? А Дарошка — дзявочае прозвішча.

Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Прыгоды доўгай восенню

КАНАЛ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ

У рамках блока праграм «У рытме дня» на канале «Культура» Беларускага радыё выходзяць праекты «Адным штрыхом» з вершамі беларускіх аўтараў, а таксама «Ранішні серыял», дзе гучыць дэтэктыў Нікалае Штэфанеску «Доўгае лета».

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе старонкі твора Міхася Стральцова «Адзін лапаць, адзін чунь». У «Радыёбібліятэцы» гучыць кніга Франсуазы Саган «Сігнал да капітуляцыі». Апавяданні чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і анонсам штотыднёвіка «ЛіМ».

Для аматараў паэзіі ў перадачы «Прачулым радком» у суботу выйдзе дзясяты выпуск сумеснага з Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы праекта «Слухаем класіка», а ў нядзелю прагучаць вершы Якуба Коласа (да 140-годдзя з дня нараджэння класікаў нацыянальнай літаратуры).

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у выхадныя складуць дзве часткі кампазіцыі спектакля «Рыбакова хата» паводле аднайменнай паэмы Якуба Коласа.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У гэтыя дні гучыць гісторыя Людмілы Рублеўскай «Прыгоды мышкі Пік-Пік», з лістапада пачнецца гісторыя Наталлі Бучынскай «Прынцэса Алівія і "жабіны вочкі"». У суботу і нядзелю ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» выйдуць кампазіцыя «Дзівосы з Брытаніі» паводле англійскіх народных казак і спектакль «Кот Максім» на музыку Алега Залётнева. Штовечар у 21:00 для маленькіх гучыць «Вячэрняя казка».

У нядзелю і чацвер увазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Развагі пра літаратуру». Радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» гэтага пісьменніка, якая гучыць на «Культуры» ў нядзелю і сераду, прапануе сустрэчу з загадчыцай аддзела Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Вольгай Наважылавай.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

31 кастрычніка — у СШ № 22 (вул. Грыцаўца, 9) на творчую сустрэчу з пісьменнікамі Мінскага гарадскога аддзялення СПБ. Пачатак у 12.30.

31 кастрычніка — на «Свята дзіцячай кніжкі» ў Цэнтральную бібліятэку (праспект Міру, 21) г. Жодзіна. Пачатак у 12.00.

1 лістапада — у публічную бібліятэку № 7 (вул. Пляханава, 97, кор. 4) на літаратурную імпрэзу, прымеркаваную да 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа. Пачатак у 13.30.

2 лістапада — на творчую сустрэчу з пісьменнікам Валерыем Максімовічам у Беларускі інстытут права (вул. Караля, 2). Пачатак у 15.00.

3 лістапада — на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым у СШ № 85 (вул. Цэнтральная, 11 а). Пачатак у 12.00.

3 лістапада — у Цэнтральную бібліятэку імя Янкі Купалы (вул. Веры Харужай, 16) на прэзентацыю кнігі для дзяцей Уладзіміра Мазго «Казкі ката-марахода». Пачатак у 11.00.

3 лістапада — у Цэнтральную бібліятэку імя Янкі Купалы (вул. Веры Харужай, 16) на творчую сустрэчу з маладымі паэтамі і празаікамі — членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пачатак у 18.00.

4 лістапада — у публічную бібліятэку № 13 (вул. Народная, 43а) на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым. Пачатак у 10.30.

Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

1 лістапада — у Гродзенскую гарадскую бібліятэку № 6 (праспект Касманаўтаў, 4 а) на ўрок здароўя з дзіцячай пісьменніцай Таццянай Сучковай «Азбука вітамінаў». Пачатак у 11.00.

ЛіМ КАЛЯНДАР

29 кастрычніка — 70-годдзе адзначае Ігар Пеня (1952), беларускі эстрадны спявак, музыкант, заслужаны артыст БССР, удзельнік ансамбля «Песняры».

30 кастрычніка — 75-годдзе адзначае Валянцін Елізар'еў (1947), беларускі балетмайстар, народны артыст БССР, народны артыст СССР.

30 кастрычніка — 70-гадовы юбілей святкуе Таццяна Карчажкіна (1952), беларуская мастачка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, графік, мастацтвазнаўца.

31 кастрычніка — 110 гадоў з дня нараджэння Юльяна Пшыркова (1912—1980), беларускага літаратуразнаўца, крытыка, заслужанага дзеяча навукі БССР.

1 лістапада — 80 гадоў з дня нараджэння Аркадзя Русецкага (1942—2021), беларускага гісторыка, культуролага, педагога.

3 лістапада — 140 гадоў з дня нараджэння Якуба Коласа (сапр. Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч; 1882—1956), беларускага паэта, празаіка, драматурга, крытыка, публіцыста, перакладчыка, вучонага, педагога, грамадскага дзеяча, заслужанага дзеяча навукі БССР, народнага паэта БССР.

3 лістапада — 110 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Палескага (сапр. Станкевіч) (1912—1971), беларускага журналіста, драматурга, дзяржаўнага дзеяча, заслужанага дзеяча культуры БССР.

4 лістапада — 135 гадоў з дня нараджэння Цішкі Гартнага (сапр. Жылуновіч Зміцер Хведаравіч; 1887—1937), беларускага празаіка, паэта, драматурга, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 27.10.2022 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 735

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2490

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 22043